ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

№ 120 (3228) Чацьвер, 30-га Мая 1929 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі.

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая, 63
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII
Тэлефоны: рэдактар—1074, сакратар—619, кантора—781

РАДЫЕ Ў ГАДЗ НОЧЫ:

ЛЁНДАН, 29. Прэм'ер Балдуін разам з Осьцінам Чэмбэрленам (міністр замежных спраў) і Нэвілям Чэмбэрленам (міністр аховы здароўя) наведалі рабочыя ваколіцы Бірмінгаму. Балдуін і яго падарожнікі былі сустрэнуты натоўпамі варожа настроеных рабочых

АПОШНІЯ НАВІНЫ **Б. С. С. Р.**

У Магілеве адбыўся другі выпуск земляўпарадкаўчага тэхнікуму ў ліку 104 чал.

Менская біржа прац выклікае для пасылкі на працу 100 чал., беспрацоўных розных саюзаў і 308 чал., нячленаў саюзу

За генэральную лінію партыі

Партыя і ўся краіна з непаслабнай увагай сочаць за работамі зьезду, за выступленьнем кожнага дэлегату, рабочага і селяніна. Адказ зьезду на пытаньні настаўленых дакладаў, прагучэў з пераконанасьцю такой сілы, перад якой лавіны змоўкнуць прадраканьні правых панікёраў.

Зьезд падмацаваў пастановы партыі з дапамогаю волі мільёнаў рабочых і сялян усёй магутнасьцю вылічэнае клясавае практыкі. На зьезьдзе ня было чутно ніводнага голасу падмацаваньня тэорыі адступленьня, якой спрабавалі палохаць партыю лідэры правай апазыцыі. **У выступленьнях прамоўцаў была выказана цьвёрдая ўпэўненасьць, што цяжкасьці будаўніцтва будуць пераможаны.**

Гэта непахісная ўпэўненасьць тым больш ясна, што ў выступленьнях ня было нічога падобна на аптымізм, ці на памяншэньне труднасьцяй. У гэтых адносінах вельмі паказальнымі зьяўляюцца спрэчкі па дакладу т. Калініна аб шляхох сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі.

Зьезд павінен быў выказацца аб тэрмінах правядзеньня аграмінімуму і кантрактацыі, аб вырашэньні эбожжавай праблемы і задачах вытворчага каапэраваньня і калектывізацыі. Перад зьездам былі выяўлены шлях капіталістычнага разьвіцьця сельскае гспадаркі і шлях сацыялізму, які нясе вялікі рост вытворчых сіл, уздым сельскае гаспадаркі і дабрабыт шырокіх бядняцкіх і серадняцкіх мас вёскі.

Зьезд яўна выказаў свой выбар паміж двума шляхамі. **Наперакор сумным прадраканьням правых укланістых партыя знайшла шлях да сьвядомасьці мас і абудзіла ў іх творчы энтузіязм, гэтую самую правільную заруку перамогі.**

Наша задача заключаецца цяпер у тым, каб цьвёрдай рукой сапраўды пераразьсці нашы апараты на работу па абслугоўваньні і пашырэньні вытворчай змычкі, каб усім даць правільнае практычнае прыстасаваньне масавай ініцыятывы і самадзейнасьці.

Калі ў свой час Ленін прапанаваў сьпяшацца з устанаўленьнем змычкі, то зараз патрэбна разьвіцьцё гэтай дырэктывы, трэба сьпяшацца з паляпшэньнем якасьці работы па правядзеньні змычкі ў яе новай вытворчай форме, зацьвердзіць пяцігадовы плян разьвіцьця народнае гаспадаркі.

Апіраючыся на волю зьезду, на волю мас, якія складаюць пераважную большасьць краіны, мы павінны ў шмат разоў узмацніць барацьбу з усімі скажэньнямі клясавай лініі, бюракратызмам і нядбайнасьцю да работы, скарыстаўшы ўсе надважнікі ўзьдзейнічаньня і ў першую чаргу сацыялістычнае спаборніцтва. Выкідаючы нягодны элемэнт, заахвочваючы лепшых і падцягваючы адстаўшых, мы дабʼемся паляпшэньня работы і выкананьня зацьверджаных плянаў.

(«ПРАВДА»)

Разгул белага тэрору ў польскіх турмах

Масавыя арышты ва Усходняй Галіцыі

ВАРШАВА, 19. Украінская газэта «Дило» паведамляе аб масавых арыштах у Тарнопальскім павеце. Арыштаваныя былі адпраўлены на аўтамабілях у Тарнопаль. Таксама ў Львове былі зроблены арышты ўкраінскіх студэнтаў, якіх абвінавачваюць у прыналежнасьці да ваеннай арганізацыі.

У 15-ці вёсках у ваколіцы Равы Рускай забаставала звыш 500 сялян, занятых на лясных распрацоўках у памешчыкаў. Забастоўшчыкі выставілі патрабаваньні аб павышэньні зарплаты.

Працэс 31 украінскіх сялян у Львове

ВАРШАВА, 19. Нядаўна ў Львове скончыўся працэс 31 украінскіх сялян з Тарнопальскага павету, абвінавачаных у прыналежнасьці да кампартыі Заходняй Украіны. Абвінавачаньне заснавана толькі на паказаньнях правакатара Юркова, якога ў часе працэсу абарона выкрыла, як злодзея. Суд прыгаварыў аднаго падсуднага да 2½ год катаржнай турмы, аднаго на 1½ гады, восем на 15 месяцаў катаржнай турмы кожнага. (ТАСС).

ЗАБАСТОЎКА НА НАФТАВЫХ ПРОМЫСЛАХ У ГАЛІЦЫІ

ВАРШАВА, 22. У Барыславі на трох нафтавых промыслах выбухнула забастоўка ў знак пратэсту супроць спробы адміністрацыі зьнізіць зарплату на 40 проц. (ТАСС).

Дэманстрацыя рабочай моладзі ў Варшаве

ВАРШАВА, 27. У зьвязку з «тыднем дзіцяці», арганізаваным польскай буржуазіяй у Варшаве, у нядзелю адбылася дэманстрацыя рабочай моладзі. Дэманстранты несьлі плякаты з надпісам: «Прэч фашысцкі «тыдзень дзіцяці». Паліцыя разагнала дэманстрантаў. Сярод варшаўскай рабочай моладзі арыштавана 80 чалавек. (ТАСС).

Новыя „гэраічныя ўчынкі" польскай ахранкі

ВАРШАВА, 19. Ахранка зрабіла ў Варшаве 20 красавіка масавыя вобыскі Шпікі зрабілі засаду і арыштавалі ўсіх, хто прыходзіў у «падазропыя кватэры». Было арыштавана каля 80 чалавек. Арыштаваныя былі дастаўлены ў ахранку, **дзе яны знаходзіліся ў барбарскіх умовах. З пяці камер—у дзьвёх няма сьвятла і вэнтыляцыі. Камэры былі набітыя людзьмі; напрыклад, у дзьвёх камэрах, якія прызначаны на 1-2 чалавекі, знаходзілася каля 20 чалавек. У камэру № 2 было пасаджана некалькі дзесяткаў жанчын.** З адным з зьняволеных з прычыны недахвату паветра і цеснаты, здарыўся прыпадак і ён страціў пры томнасьць. Сьледчы зьявіўся толькі праз трое сутак і заявіў арыштаваным, што з прычыны іх прыналежнасьці да кампартыі (гэтае абвінавачаньне ўтрымавана толькі па паказаньнях паліцэйскіх агэнтаў) яны будуць пасаджаны ў турму «Павіяк».

У часе прабываньня ў ахранцы **быў зьбіты зьняволены Шапіра**, якога начальнік Завіцкі ў часе допыту некалькі раз ударыў кулаком, прыгаварваючы: «Вось мы табе наллем некалькі бутэляк вады ў лёгкія, так ты запяеш».

Зьняволены Пурман, які ад імя ўсіх зьняволеных патрабаваў вызваленьня, або зьмены нязносных умоў прабываньня ў ахранцы, быў **зьбіты двума агэнтамі па загаду памоцніка камісара ахранкі Пагаржэльскага. Турэмны доктар пасьведчыў факт зьбіеньня Пурмана.**

Зьняволенаму Сакорскаму (ППС—ляўіца), які адмовіўся даваць паказаньні, чыноўнікі ахранкі пагражалі забойствам.

АРЫШТ ТРОХ НЯМЕЦКІХ СТУДЭНТАЎ

ВАРШАВА, 22. Львоўская ўлада арыштавала трох нямецкіх студэнтаў, якія прыехалі з Бэрліну. Арыштаваных абвінавачваюць у шпіянажы на тэрыторыі Усходняй Галіцыі. (ТАСС).

Сьмерць украінскага палітзьняволенага ў Польшчы

ВАРШАВА, 19. Нядаўна ў турме ў Ленчыцы апмёр палітычны зьняволены—украінскі селянін Сарока. Ён—удзельнік працэсу ва Ўладзіміры Валынскім (150 удзельнікаў працэсу былі прыгавораны ў агульнай складанасьці да 1000 год катаржнай турмы) і быў асуджаны да 4-х год катаржнай турмы. У выніку жахлівых турэмных умоў Сарока захварэў на «скоротечные» сухоты. Усе просьбы яго свякоў аб водпуску для лячэньня заставаліся без адказу. Пасьля некалькіх месяцаў пакуты ў турэмнай камэры тав. Сарока памёр.

Катарга за чырвоны сьцяг

ВІЛЬНЯ, 28. У ноч з 30 на 31 жніўня мінулага году на Макавай вуліцы ў Вільні паліцыя арыштавала рабочага І. Шуф'яна, які вывешваў чырвоны сьцяг з надпісам: «Прэч фашысцкую амністыю, патрабуем звальненьня ўсіх палітзьняволеных».

Віленскі акруговы суд, разгледзеўшы пры зачыненых дзьвярах справу Шыф'яна, засудзіў яго на 4 гады катаргі без дастасаваньня амністыі. («К. Віл.»).

Пілсудзкі ў якасьці сьведкі па справе Чэховіча

ВІЛЬНЯ, 28. Абаронца б. міністра Чэховіча падаў заяву сьледчаму Дзяржаўнага Трыбуналу аб неабходнасьці допыту ў якасьці сьведкі Пілсудзкага, які быў старшынёю ўраду ў той час, калі бюджэт быў перавышаны на 560 млн. злотых. 27-га мая сьледчы прыехаў да Пілсудзкага і на працягу двох гадзін яго дапытваў. Частка паказаньняў Пілсудзкага будзе абвешчана ў друку.

Па закону пры допыце сьведак маюць права прысутнічаць соймавыя абвінаваўцы. Грунтуючыся на гэтым, адзін з трох соймавых абвінаваўцаў Чэховіча—дэпутат Выжыкоўскі пажадаў прысутнічаць пры допыце, але Пілсудзкі яго не дапусьціў. («К. Віл.»).

ПЕРАДВЫБАРЧАЯ БАРАЦЬБА Ў АНГЛІІ

КАМПАНІЯ КАМУНІСТЫХ ПРАХОДЗІЦЬ З ВЯЛІКІМ ПОСЬПЕХАМ

ЛЁНДАН, 27. Прадвыбарчая барацьба ў Англіі канчаецца: «чырвоны ліст», накшталт зіноўеўскай фальшыўкі, відавочна, на гэты раз ня будзе выпушчаны. Буржуазія не заклапочана пэрспэктывай прыходу да ўлады габінэту рабочай партыі. У буржуазных колах заўважаецца нават тэндэнцыя не перашкаджаць абяпанкам аб нацыяналізацыі (гутарка ідзе аб чыгунках і горнай прамысловасьці), якія ёсьць у прадвыбарчых праграмах ня толькі рабочай партыі, але нават лібэралаў і кансэрватараў. У буржуазных колах разьлічваюць, што дзякуючы цеснаму супрацоўніцтву паміж прафсаюзамі і рабочай партыяй гэта «нацыяналізацыя» акажыцца для зацікаўленых колаў больш выгаднай пры правядзеньні яе ўрадам гэтай партыі, чым калі-б яе праводзіў кансэрватыўны ўрад, да якога рабочыя адносяцца з адкрытай варожасьцю.

Орган лібэралаў «Манчэстэр Гардыян» піша ў сваёй перадавіцы:

«Мільёны людзей спадзяюцца, што выбары, якія адбудуцца ў чацьвер, канчаткова зьмятуць кансэрватыўны ўрад».

Далей газэта заяўляе: «Мільёны рабочых і сялян вызваленьня чакаюць не ад Англіі, а ад Расіі». Газэта выказвае ўпэўненасьць, што толькі в паражэньнем кансэрватараў у Англіі вернецца давер'е да будучыні краіны. Газэта ўкосна выказваецца за стварэньне габінэту рабочай партыі, прадракаючы, што лібэралы атрымаюць ня больш 120 мандатаў.

Вельмі цікава адначаць заяву вядомага кіраўніка хэмічнага трэсту лёрда Мэльката (ён-жа Монд, па ініцыятыве якога вядуцца перагаворы паміж прамыслоўцамі і прафсаюзамі аб устанаўленьні «міру ў прамысловасьці»), што ён **ня бачыць ніякай розьніцы паміж кансэрватарамі, лібэраламі і рабочай партыяй.**

Прадвыбарчая кампанія камуністых праходзіць з вялікім посьпехам. Рабочыя ўсё больш пераконваюцца, што толькі кампартыя вядзе барацьбу супроць капіталістычнай рацыяналізацыі і супроць плянаў абвяшчэньня вайны СССР. У Ольдэрпоце—вайсковы цэнтр лёнданскага раёну—адбыўся камуністычны мітынг; фашысцкія афіцэры спрабавалі сарваць яго. Але ім прышлося адступіць перад абуранымі салдатамі, якія пагражалі расправіцца з імі сілай.

(«ИЗВЕСТИЯ»).

Камуністычныя дэпутаты выстаўлены у 25 выбарчых акругах

ЛЁНДАН, 21. Кампартыя вылучае па ўсеагульных выбарах 25 кандыдатаў. Упяршыню камуністычная партыя выступае, як самастойная палітычная сіла, незалежна ад рабочай партыі. Кандыдаты рабочай партыі вылучаюцца супроць камуністых ва ўсіх 25 выпадках. Сур'ёзная барацьба разгорнецца ў Сіхэм-Харборы, дзе камуністы Гары Паліт вельмі папулярны сярод рабочых, выступае супроць Макдональда. Ва ўсходняй Рондзе, Артур Хорнэр, камуністы-гарняк, выступае супроць Уотса Морцыі гарнякоў Паўднёвага Ўэльсу. У бліжэйшых да Ронды выбарчых акругах камуністы Кэмпбэл выступае супроць Харт Хорна, а камуністы Вільсон супроць Моргана Джэмса. Супроць Саймона, які належыць да лібэральнай партыі, выступае Шаўкат Усмані, адзін з ліку 31 лідэраў індыйскіх прафсаюзаў, які знаходзіцца зараз у турме. Як вядома Саймон адмовіўся падтрымаць хадайніцтва аб вызваленьні Ўсмані.

У шатлядзкіх выбарчых акругах камуністычныя дэпутаты выступаюць супроць членаў рабочай партыі, якія зьяўляюцца членамі апошняга парляманту ў 4-х раёнах. Саклатвала выступае ў паўночным Батэрсі, ад якога ён быў абраны ў апошні парлямант. Але ў мінулы раз Саклатвала ня меў працыніка з рабочай партыі, а на гэты раз такі ёсьць. Далей супроць членаў рабочай партыі дэпутатаў апошняга парляманту, выступае рад камуністых. Усе камуністычныя кандыдаты акрамя аднаго—пралетарскага паходжаньня. (ТАСС).

У УСЕСАЮЗНЫ ЗЬЕЗД САВЕТАЎ

Выбары Ўсесаюзнага ЦВК і савету нацыянальнасьцяй

МАСКВА, 29. Усесаюзны зьезд саветаў, які закончыўся 28 мая, абраў 586 членаў Саюзнага ЦВК і 33 кандыдаты, Сярод членаў ёсьць т. т. Баўман, Бубноў, Будзённы, Бухарын, Варашылаў, Дагадаў, Енукідзе, Каганові, Калінін, Каменеў С. С., Кіраў, Кісялёў, Крэсьцінскі, Крупская, Кржыжаноўскі, Кубяк, Куйбышаў, Літвінаў, Лобаў, Менжынскі, Мікаян, Молатаў, Арджанікідзэ, Пятроўскі, Пятакоў, Рудзутак, Рыкаў, Сьмірноў А. Э., Сталін, Сырцоў, Томскі, Угланаў, Уншліхт, Чарвякоў, Чычэрын, Чубар, Шпарт, Яраслаўскі і інш. Члены саюзнага савету і кандыдаты зьездам зацьвярджаюцца аднагалосна.

У склад савету нацыянальнасьцяй абраны: т. т. Андрэяў, Пахомаў, Уханаў і іншыя ад РСФСР, ад УССР т. т. Касіёр, Скрыпнік. Затонскі і іншыя. Ад Беларусі — Хацкевіч, Жылуновіч, Славінскі, Галадзед і іншыя. Ад Башкірскай рэспублікі т. т. Юрэвіч, Даутаў, Бычкоў, Ізмайлава і інш. Ад Дагестанскай АССР Аверханаў, Валітбэкаў, Густаеў, Мураўёў. Ад Казакстану—Арыкава, Машураў, Чэрдыбаеў. Ад Крымскай АССР—Кубаеў, Абдурмэдаў. Ад Сац. Рэспублікі немцаў Паволжжа—Шварц, Васільлеў, Гаўрылаў. Ад Татарскай АССР—Матухлін, Карэлеў, Ахмэд, Жарава і інш.

****

Вычышчана 138 актыўных белагвардзейцаў

РОСТАЎ ДОН, 28. Скончылася чыстка савецкага апарату. Праверана 135 установаў, вычышчана 579 чалавек, з іх 470 без права паступленьня ў савецкія ўстановы і каапэрацыйныя арганізацыі. У ліку вычышчаных шмат памешчыкаў, купцоў, домаўласьнікаў, 138 актыўных белагвардзейцаў.

Будаўніцтва саўгасаў

МАСКВА, 28. На пасяджэньні камісіі СПА па будаўніцтву было заслухана паведамленьне Зернатрэсту аб праграме будаўнічых работ у саўгасах трэсту на бягучы год. У гэтым годзе трэст павінен арганізаваць 44 буйных саўгасаў, галоўным чынам, у Сярэдняй і Ніжня-Волжскім краі.

У будучым годзе мяркуецца арганізаваць 110-112 саўгасаў. На Зернатрэст ускладаецца таксама арганізацыя ў 1930 годзе сеці трактарных станцый. Камісія адзначыла, што Зернатрэст прарабіў за параўнаўча кароткі час вялікую арганізацыйную і падрыхтоўчую работу. Трэсту прапанавана максымум увагі ўдзяліць пытаньню патаненьня будаўніцтва.

Перамога рэвалюцыйнага крыла на выбарах фабкому у Бэрліне

БЭРЛІН, 27. На перавыбарах фабкому на буйным мэталёвым прадпрыемстве «Бэргман» у Бэрліне сьпіс рэвалюцыйнага крыла прафсаюзаў атрымаў 2.105 галасоў. Рэфармістыя атрымалі 1.008 галасоў. Такім чынам рэвалюцыйнае крыло атрымала ²/₃ мандатаў у фабкоме супроць 50 проц. у ранейшым складзе. (ТАСС).

*

БЭРЛІН, 25. Па папярэдніх даных, выбары ў галоўны фабрычна-заводзкі камітэт дзяржчыгунак далі рэвалюцыйнай апазыцыі 18.000 галасоў. Ва ўмовах жорсткага тэрору рэфармістых і адміністрацыі гэта зьяўляецца значным посьпехам. (ТАСС).

Надзвычайная сэсія сойму ня будзе склікана

ВАРШАВА, 27. Як падаюць газэты, у тым ліку і афіцыёзныя, польскі ўрад адмовіўся ад праекту склікаць надзвычайную сэсію сойму ў працягу бягучага лета. (ТАСС).

Адкрытае братаньне польскай улады з грузінскімі контр-рэвалюцыянэрамі

МАСКВА, 29. У «Известиях» зьмешчана тэлеграма ўласнага карэспандэнта з Варшавы наступнага зьместу:

«У Варшаве адбыўся ўрачысты сход, арганізаваны грузінскай эміграцыяй. На маніфэстацыі грузінскай эміграцыі прысутнічалі афіцыйныя прадстаўнікі польскай улады. Рад польскіх газэт прысьвяціў артыкулы гэтаму сходу. «Кур'ер Поранны» з прычыны гэтага заяўляе, што бакінска-батумскі нафтаправод з часам стане кабелем, які злучае дарогі Каўказу і Эўропы». Камэнтуючы тэлеграму, «Известия» пішуць:

Мы адзначаем новы факт нелёяльнасьці польскай улады ў адносінах да Савецкага Саюзу. Польская ўлада старанна падтрымлівае ўсялякія контр-рэвалюцыйныя авантурысцкія элемэнты, якія рэвалюцыя выкінула па-за межы СССР. У «гостеприимной» Польшчы знайшлі гасьцінны прытулак усе адценьні эміграцыі, пачынаючы ад рускіх манархістых і канчаючы грузінскімі меншавікамі. З апошнімі польская ўлада ўжо даўно знаходзіцца ў «дзелавым» кантакце, які дастаўляў паляком шмат няпрыемнасьцяй. Даволі ўспомніць дзейнасьць былога польскага паспаньніка ў Анголы Кноля, працэс агента 2-га аддзелу польскага генэральнага штабу Пложнага, арыштаванага пры пераходзе саюзна-польскай граніцы разам з групай грузінскіх меншавікоў, якія накіроўваліся для контр-рэвалюцыйнай работы ў СССР. Грузінскія меншавікі, якія маюць такія вялікія сувязі з польскай разьведкай, цяпер, калі афіцэры 2-га аддзелу занялі кіруючыя пасты, аказаліся ў блізкіх адносінах з самымі высокімі польскімі саноўнікамі. Адкрытае братаньне польскай улады з грузінскімі контр-рэвалюцыянэрамі, зьяўляючыся новым доказам польскай нелёяльнасьці, паказвае таксама, у якой меры палітыка Польшчы падпарадкавана замежным уплывам. (ТАСС).

Генэральная рэпэтыцыя ваяніязацыі ў Японіі

Насельніцтва Асакі яшчэ добра памятуе грандыёзныя манэўры, якія адбываліся ў горадзе ў мінулым годзе з удзелам паветранага флёту, хэмічных атрадаў і іншых радоў зброі японскай армії. На гэтых манэўрах японскі генэральны штаб вывучаў магчымасьць нападу ворага на буйнейшы прамысловы цэнтр Японіі—Асаку. Але манэўры паказалі, што варожая паветраная эскадрыльля можа нанесьці прамысловаму сэрцу Японіі вельмі значныя страты. У гэтым годзе мілітарысцкая Японія рыхтуецца да яшчэ больш грандыёзных манэўраў з 24-га чэрвеня па 3-е ліпеня. Галоўная асаблівасьць іх гэта тое, што ў Японіі ў манэўры ўцягваецца пагалоўна ўсё мірнае насельніцтва адпаведнага раёну.

Да актыўнага ўдзелу ў манэўрах прыцягваюцца акрамя рэгулярнага войска і абвучаных рэзэрвістых усе школьныя батальёны раёну (паводле апошняга ваеннага закону вучні ўсіх навучальных устаноў Японіі праходзяць сыстэматычную ваенную падрыхтоўку).

У манэўрах прымуць удзел таксама ўсе наліччныя транспартныя сродкі (ад вала да аўтамабілю), каму-б яны не належалі—дзяржаве, грамадзкім арганізацыям, гандлёвым і прамысловым фірмам і прыватным асобам.

Манэўры, якія маюць адбыцца і якія зьяўляюцца генэральнай рэпэтыцыяй ваенізацыі ўсяго насельніцтва, **паказваюць, што Японія ўпарта рыхтуецца да вайны. Па прыкладу іншых капіталістычных краін, японская буржуазія імкнецца абярнуць краіну ва «узброеную нацыю».**

Пры кіраўніцтве прэм'ера ўжо пяты год існуе спэцыяльны вярхоўны камітэт нацыянальных рэсурсаў. Задача камітэту — ня толькі дакладны вучот усіх рэсурсаў краіны, але і найлепшае іх скарыстаньне. Манэўры павінны служыць праверкай правільнасьці мэтадаў, ужываемых камітэтам. Мірнае штодзённае жыцьцё раёну ў часе манэўраў будзе спынена на 9 дзён.

У якім раёне Японіі адбудуцца манэўры—покуль ваенная таямніца.

А. Б.

Зьезд нямецкай сац.-дэмакратыі

ЗА ЦЕСНЫ САЮЗ З БУРЖУАЗІЯЙ

БЭРЛІН. Пасьля справаздачы ЦК, зьездам сацыял-дэмакратаў былі заслуханы даклады аб партыйнай і асьветнай рабоце, аб рабоце сярод жанчын і справаздача кантрольнай камісіі. У крытыцы кааліцыйнай палітыкі апазыцыяй зусім адсутнічала прыцыповая лінія.

Апазыцыя выказвала толькі небясьпеку што кааліцыйная палітыка, як яна ажыцьцяўляецца Мюлерам, Гільфэрдынгам, Зэвэрынгам і Вісэлем, можа пашкодзіць палітычнаму ўплыву сацыял-дэмакратычнай партыі на тых рабочых, якія ідуць яшчэ за сацыял-дэмакратамі.

Апазыцыйным прамоўцам адказваў у вялікай прамове рэйх-канцлер Мюлер, які галоўным чынам супярэчыў супроць прапановы Кюнстлера і Лідткэ аб тым, каб міністры сацыял-дэмакраты разам з усёй сацыял-дэмакратычнай фракцыяй рэйхстагу галасавалі супроць чарговага асыгнаваньня на пабудову браняносца.

«Мне ніколі ня прыходзіла ў галаву,—сказаў Мюлер,—таварыць выбарчыкам, што браняносец ня будзе будавацца. Калі з-за пытаньня аб браняносцы сацыял-дэмакратычная партыя сарве цяперашні ўрад, дык яна гэтым зробіць сябе сьмешнай. Быць можа сусьветнай вайны можна было-б упікнуць. калі-б Амстэрдамскі кангрэс II-га Інтэрнацыяналу ў 1904 годзе не забараніў Жорэсу ўвайсьці ў склад тагочаснага францускага ўраду, і калі-б імпэратарская Нямеччына ня трымала сацыял-дэмакратыю далёка ад ураду».

Мюлер рэзка крытыкаваў таксама заяву апазыцыйнага дэлегата Экштэйна за тое, што «сацыял-дэмакратыя адказвае не за ўсю дзяржаву, а толькі за рабочую клясу». Па словах Мюлера, гэтая заява «зьяўляецца пашчоўнай усяму таму, што сацыял-дэмакратыя гаварыла і рабіла ў працягу апошніх 10 год».

Пасьля Мюлера з заключным словам выступіў дакладчык ЦК Фогель, які заявіў:

«Калі будзе прынята прапанова Кюнстлера і Лідткэ, дык сацыял-дэмакратычная партыя ўжо заўтра ня будзе ўдзельнічаць ва ўрадзе. Хто ня хоча, каб сацыял-дэмакраты выйшлі з ўраду цяпер, той павінен галасаваць за прапанову ЦК».

Зьезд большасьцю 256 супроць 138 галасоў ухваліў прапанову ЦК аб простым пераходзе да чарговых спраў бяз прыняцьця якіх-небудзь пастаноў па прапановах, якія датычыць пытаньня аб кааліцыі з буржуазнымі партыямі і пытаньня аб пабудове браняносца.

„САЦЫЯЛІСТЫЯ" ФРАНЦЫІ СУПРОЦЬ СКАРАЧЭНЬНЯ НЯМЕЦКІХ РЭПАРАЦЫЙ

ПАРЫЖ, 25. Сацыялістычная фракцыя палаты дэпутатаў (старшынёй якой уноў абраны пасьля свайго звароту ў палату Леон Блюм) унесла на разгляд палаты праект рэзалюцыі па пытаньні аб урэгуляваньні рэпарацыйнага і міжсаюзьніцкіх даўгоў. Рэзалюцыя дамагаецца канчаткова ўпарадкаваць гэтае пытаньне, але **разам з тым выказвае жаль, што французкі ўрад прадаставіў сваім дэлегатам на рэпарацыйнай канфэрэнцыі права зьніжэньня ўласна рэпарацыйных прэтэнзій Францыі і Бэльгіі да Нямеччыны.** Зазначаючы, што гэтыя сумы прызначаюцца на адпаўненьне зруйнаваных вобласьцяй, рэзалюцыя кажа, што па праву справядлівасьці нямецкія плацяжы павінны накіравацца ў першую чаргу іменна на гэту мэту.

Далей рэзалюцыя зазначе, што скарачэньне нямецкага доўгу можна дапусьціць толькі за кошт пераразьмеркаваньня агульных фінансавых абавязкаў, г. зн. пры ўмове перагляду міжсаюзьніцкіх даўгоў і ўзаемных прэтэнзій. У зьвязку з гэтым, рэзалюцыя прапануе францускаму ўраду дагаварыцца з іншымі эўрапейскімі дзяржавамі аб супольнай падачы гэтае прапановы ўраду ПАЗШ. Нарэшце ,рэзалюцыя пратэстуе супроць далейшага перакачваньня золата в Эўропы ў Амэрыку. Такім чынам, рэзалюцыя сацыялістых у сваёй аргумэнтацыі цалкам і поўнасьцю супадае з аргумэнтамі крайніх правых партый. (ТАСС).

Голад у польскім манчэстэры

Беспрацоўе ў Лодзі абвастраецца в кожным днём. Пад выглядам рамонту вачыняюцца ўсё новыя і новыя фабрыкі, выкідаюцца на вуліцы новыя і новыя тысячы рабочых. А часова яшчэ застаўленыя на фабрыках у пераважнай большасьці (60 проц.) працуюць два дні (рэдка тры) на тыдзень. Толькі 15 проц. усіх Лодзінскіх ткачоў маюць нагрузку на поўны шасьцідзённы рабочы тыдзень.

У параўнаньні з поўнымі беспрацоўнымі, або з часткова занятымі, іх становішча лепшае. Але каб зразумець, што азначае гэтае «лепшае становішча», трэба ўспомніць, што нават згодна вестак нэпэсаўскага «Роботніка» сярэдняя зарплата ў Лодзі роўна 4,5 злотым за дзень (99 к.), або 24 руб. за месяц. А ёсьць шмат катэгорый, якія нават пры поўнай працоўнай нагрузцы заробліваюць за месяц менш 20 руб. І гэта пад бязупыннаю пагрозаю звальненьня за розныя прычыны. Так, недастатковая «ветлівасьць» работніцы да майстра пагражае ёй неадкладным звальненьнем.

У Лодзі зарплата ніжэй, чым ва ўсёй Польшчы. Праца жанчын аплачваецца надзвычайна слаба. Так, жанчына практыкантка заробляе ў Лодзі 10 злотых у месяц. Пад рознымі пардлогамі шырока ўжываецца дармовая работа падросткаў. Да таго-ж у Лодзі самы доўгі рабочы дзень—каля 16 гадзін.

При такой галоднай «нармальнай» зарплаце рабочая сям'я можа існаваць у больш-менш цярпімых умовах толькі пры аднячасовай працы некалькіх сваіх членаў, калі аднячасова працуюць і бацькі і дзеці. Цяпер-жа такіх выпадкаў зусім няма.

Гаспадарчы крызіс у Польшчы, які ўсе больш паглыбляецца, адбіўся ў першую чаргу на лодзінскай тэкстыльнай прамысловасьці.

Зараз у Лодзі каля 40-50 тысяч рабочых знаходзяцца зусім без працы. Калі ўзяць пад увагу «заработкі» няпоўна занятых, дык гэта азначае, што **ўся рабочая Лодзь галадуе ў літаральным сэнсе гэтага слова**, прычым для большасьці галадоўка гранічыць з пагрозаю галоднае сьмерці. Вось чаму ў хроніцы лодзінскіх газэт так зачасьцілі выпадкі самагубстваў змучаных голадам рабочых і работніц.

Афіцыйна-ж на біржы працы лічыцца зарэгістраваных толькі 17.000 беспрацоўных. А дапамогу па беспрацоўі атрымлівае яшчэ меншая колькасьць, **бо па правілах фашысцкага ўраду права на дапамогу па беспрацоўі мае толькі сям'я, якая складаецца ня менш як з 5 чалавек** («Роб.» 22-V). Значыць рабочы з жонкаю і двумя малымі дзяцьмі дапамогі па беспрацоўю не атрымлівае. Заработкаў-жа часовых, сэзонных у Лодзі амаль што няма. Лодзінскі самаўрад, пад кіраўніцтвам пэпэсаўцаў, у 1928 годзе трымаў толькі 4.000 сэзонных рабочых, а ў гэтым годзе больш палавіны іх звольніў, спасылаючыся на адсутнасьць крэдытаў. Прыняцьце-ж на работу паўтары-дзьвёх тысяч сэзонных рабочых на 40-50 тысяч беспрацоўных—вялікага значэньня ня мае.

Рабочыя жывуць у кашмарных кватэрных умовах: 67,3 проц. усіх кватэр у Лодзі складаюцца толькі з аднаго пакою, у якім жыве ад 4 да 14 чалавек.

Лодзінскія прамыслоўцы, будуючы фабрыкі, зусім не клапаціліся ні аб разьмяшчэньні рабочых, ні аб дабрабыце гораду. Іх выключным дэвізам было і ёсьць нажыцца, як найхутчэй. А асноўнаю крыніцаю прыбыткаў ёсьць эксплёатацыя таннае рабочае сілы. Яна зраўнаважвае і дрэнпае абсталяваньне і дрэнную арганізацыю вытворчасьці і збыту. Збыт лодзінскіх тавараў, асабліва збыт заграніцу, пастаўлен зусім нездавальняюча. Нават амэрыканскі кантралёр Дзюі зазначыў на гэта.

У атмасфэры панікі, якая стварылася нячуванымі па разьмерах звальненьнямі рабочых, лодзінскія прамыслоўцы прабуюць атыгрыцца на рабочых і ўрваць пад шумок сёе-тое з іх галоднага заработку. Апошнія звальненьні рабочых носяць арганізаваны характар. Гэта даводзіць тая акалічнасьць, што яны пачаліся аднячасова на ўсіх прадпрыемствах, ня выключаючы нават самых буйных фабрык. Гэтым сваім салідарным выступленьнем прамыслоўцы прасьлядуюць дваістую мэту: з аднаго боку, тэрорызаваць рабочага, каб ён вгадзіўся ахвяраваць частку свайго заработку на выраўнаньне няспрыяючай кан'юнктуры рынку, і з другога—прымусіць урад найсьці на дапамогу прамыслоўцам новымі датацыямі і крэдытамі.

Жабрацкая зарплата, масавае беспрацоўе, кашмарныя жыльлёвыя ўмовы—вось тры галоўныя балячкі, якія мучаць рабочую Лодзь і якія вырастаюць з самых асноў польскага капіталізму. Поўнае зьнішчэньне іх можа быць толькі пры поўным зьнішчэньні капіталістычнага ладу ў Польшчы. Рабочыя Лодзі гэта разумеюць і ўсё болей ідуць да кампартыяй, адкідаючы на бок пэпэсаўскіх балбатуноў.

Нядаўна ў Варшаву прыяжджала спэцыяльная дэлегацыя лодзінскага магістрату на чале з намесьнікам старшыні меставае рады, каб выклапатаць крэдыты. Дэлегацыя пабывала ў некалькіх гаспадарчых міністэрствах, страшыла пэрспэктываю галоднае рэвалюцыі, але фашысцкі ўрад не зьвярнуў на гэта ўвагі. Фашысцкі ўрад, які прысьпешаным тэмпам вядзе пабудову заводаў атрутных газаў, узбраенае арміі і стратэгічную падрыхтоўку да вайны супроць Савецкага Саюзу, адмаўляецца даваць крэдыты. Ён спадзяецца на сваю паліцыю, спэцыяльна трэніруемую для вулічных боек з ужыцьцём апошняе ваеннае тэхнікі. Чорнасоценныя ўдзельнікі ўрэдавага блёку, на манэр рэдактара Віленскага «Слова», **адкрыта кажуць, што крывапусканьне на барыкадах было бы нават карысна з іх пункту гледжаньня, бо пасьля задушэньня рэвалюцыі настала-бы пара абвостранае рэакцыі, спрыяючая манархічным намерам.**

Становішча ў Лодзі ня толькі застаецца напружаным, але яшчэ больш абвастраецца.

МІХАСЬ БАРАВЫ.

З такім „выкананьнем" дырэктыў РСІ трэба пакончыць

УЗМАЦНІЦЬ РЭПРЭСІІ СУПРОЦЬ ТЫХ, ХТО ВАЛЫНІЦЬ І БЮРАКРАТЫЧНА СУПРАЦІЎЛЯЕЦЦА ПАСТАНОВАМ РСІ

Абураючыя нецярпімыя рэчы робяцца з выкананьнем дырэктыў РСІ ў Беларусі. Бюракратычнае апаратнае супраціўленьне прыходзіцца ламаць пры вялікім напружаньні сіл. Няма ніводнае пастановы РСІ, дзе-б не адзначаліся факты невыкананьня важнейшых дырэктыў. Вось некалькі характэрных, хаця і «дробных» спраў.

У кастрычніку 1928 году Мазырская РСІ дала дырэктыву аб скарачэньні ў акрстатбюро аднэй непатрэбнай адзінкі бухгальтара. Тут і разумець няма чаго: росчаркам пяра выканаць пастанову ці... дабіцца ва ўстаноўленым парадку перагляду, калі гэта пастанова нямэтазгодна. Мінае тры месяцы і пакуль не пацягнулі да адказу ў РСІ—ня выканалі.

У мінулым годзе Бабруйская РСІ пыяла рад пастаноў, якія аздараўляюць работу біржы працы. Нядаўна РСІ праверыла выканан

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

ПЕРАВЫБАРЫ БЮРО ЯЧЭЕК КП(б)Б

На аснове масавай самаправеркі ўсіх галін работы парт'ячэйкі яшчэ шчыльней згуртуюць вакол новаабраных партворганаў партыйныя масы для барацьбы за генэральную лінію партыі

Шырока разгорнутая самакрытыка, унутрыпартыйная дэмакратыя на перавыбарчых сходах ячэек—лепшы паказчык таго, наколькі неабгрунтаваны паклёпы правых на партыю і яе кіруючыя органы аб зажыме і інш.

Яшчэ з большай энэргіяй за выкананьне асноўных задач партыі

(Ячэйка КП(б)Б заводу «Энэргія», Менск)

Завод расьце. Прадукцыйнасьць працы за апошні час павялічылася. Працоўная дысцыпліна на заводзе маднее. Лік прагулаў прадмета памяншаецца.

Вось дасягненьні, якімі можа ганарыцца калектыў заводу «Энэргія».

Партыйная арганізацыя заводу заўсёды неаслабна кіравала гаспадарчым жыцьцём заводу. Парткалектыў «Энэргіі» няўхільна праводзіў ленінскую лінію партыі ў штодзённай рабоце.

Чырвонаштандартная «Энэргія»—адзін з першых заводаў у Беларусі, што ўступілі ў сацыялістычнае спаборніцтва. Рабочыя «Энэргіі» з энтузіязмам выконваюць сацыялістычны дагавор аб павышэньні прадукцыйнасьці, зьніжэньні сабекошту прадукцыі.

Рады парткалектыву заводу папаўняюцца лепшымі перадавымі рабочымі. За 6 месяцаў прынята ў партыю 15 чалавек.

Але і на «Энэргіі» ёсьць рад адмоўных зьяўішч.

Беларусізацыя праводзіцца слаба. Некаторыя заводзкія арганізацыі не правялі свае работы на беларускую мову. Зразумела, віна за гэта падае, перш за ўсё, на партыйную ячэйку.

Якасьць партыйнай вучобы і культурна-бытавой работы нізкая. Сярод асобных партыйцаў наглядаецца няўпэўненасьць, хвасьцізм. Асобныя таварышы падтрымліваюць настрої адсталых груп беспартыйных рабочых.

Сакратар ячэйкі т. Сагаловіч, які рабіў справаздачу бюро, адкрыта прызнаў, што масавая, культурна-выхаваўчая работа па цэхах была пастаўлена слаба. Цэхавыя арганізатары амаль не адчуваліся. Ніякай сыстэматычнай работы з цэхоргамі бюро ячэйкі не праводзіла. У спрэчках многія таварышы паказвалі на тое ненармальнае становішча, што часамі бюро ячэйкі падмяняла сабою заўком.

Наглядалася таксама і адарванасьць бюро ад шырокіх мас партыйцаў; важныя пытаньні вырашаліся ў вузкім коле членаў бюро ячэйкі. Аднак, гэты недахват бюро ячэйкі своечасова выправіла.

У рэзалюцыі, прынятай ячэйкай па справаздачы бюро, работа апошняга прызнана здавальняючай. Ячэйка паставіла перад сабою задачу яшчэ больш уцягнуць масу рабочых у сацыялістычнае спаборніцтва, дабіцца яшчэ большых посьпехаў на фронце ўзьняцьця прадоўнай дысцыпліны, павялічэньня прадукцыйнасьці працы, зьніжэньня сабекошту прадукцыі і г. д.

Ячэйка даручыла новаму бюро ўзмацніць палітычную, масавую, культурна-выхаваўчую работу, павесьці рашучую барацьбу з адсталымі хвасьцісцкімі настроямі сярод асобных камуністых і беспартыйных.

Сход аднадушна асудзіў правы ўхіл і прымірэнцтва да яго і даручыў бюро павесьці шырокую растлумачальную работу аб сутнасьці і карэньнях ухілаў ад ленінскае лініі партыі.

У новае бюро абрана 9 членаў і 3 кандыдаты. Склад бюро адноўлены на 70 проц.

С. Г.

Партарганізацыі часьцей БВА перад чысткай

МенАКК КП(б)Б падагуліла вынікі падрыхтоўкі вайсковых арганізацый КП(б)Б да чысткі партыі.

Партарганізацыі часьцей БВА правялі вялікую падрыхтоўчую работу да праверкі і чысткі сваіх радоў. Характарыстыкі на ячэйкі і парткалектывы дэтальна абгаворваліся кожнай ячэйкай. Інструкцыя ЦКК УсеКП(б) аб парадку правядзеньня чысткі прапрацавана.

Асабліва ўважліва аднесьліся ячэйкі да падбору кандыдатур у камісіі па чысткі.

Гэтыя кандыдатуры прайшлі цэлы рад інстанцый раней чым былі апублікаваны ў друку.

Усяго вайсковай арганізацыяй на тэрыторыі Менскай акругі вылучана ў праверачныя камісіі 35 чалавек, з якіх 12 ад грамадзянскіх арганізацый. Цікава падаць якасны склад гэтых старшынь па партстажы і сацыяльным становішчы. З 12 старшынь камісій 10 таварышоў маюць дарэвалюцыйны партстаж. Рабочых сярод старшынь камісій 11 чал., служачых—1.

У члены камісій уваходзяць 23 таварышы, з якіх з дарэвалюцыйным стажам —1 чал., са стажам з 1917 г.—1 ч., з 1918-19 г. г.—15 чал., з 1920-21 г. г.—6 чалавек. Рабочых у складзе членаў камісій 18 чал., сялян—4 і 1 батрак.

Наколькі добра падабраны кандыдатуры ў камісіі па чысткі вайсковых ячэек сьведчыць той факт, што дагэтуль адводаў гэтым таварышом зусім не паступала.

Г.

ПАРТХРОНІКА

3-ці ПЛЕНУМ МЕН. АК КП(б)Б

6-га чэрвеня адбудзецца чарговы пленум Менскага АК КП(б)Б.

РАЁННЫЯ ВЯСКОВЫЯ ПАРТКАНФЭРЭНЦЫІ

Паводле пастановы бюро Мен. АК КП(б)Б перавыбары бюро ячэек па вясковых партарганізацыях Меншчыны будуць праведзены в 1-га чэрвеня па 1 ліпеня. У ліпені адбудуцца раённыя партканфэрэнцыі і раённыя сходы вясковых арганізацый КП(б)Б.

* * *

Менакругком камандыраваў тав. Нісэнбаума на ўсесаюзны зьезд антыалькагольных таварыстваў. Тав. Нісэнбаум едзе на зьезд у якасьці дэлегата ад Менскай акругі.

У Менскім АК ЛКСМБ

КУРСЫ КАМСАМОЛЬСКАГА АКТЫВУ

Бюро Мен. АК ЛКСМБ прызнала патрэбным арганізаваць у Менску курсы камсамольскага актыву. Праграма курсаў разьлічана на 3 гады. Курсанты будуць займацца па 4 дні ў тыдзень. На курсы будзе прынята 60 камсамольцаў.

Бюро пастанавіла пакінуць 50 проц. месц за актывам вытворчых ячэек ЛКСМБ.

Бюро вылучыла спэцыяльную камісію, якая павінна выпрацаваць пэўную праграму курсаў і вывучыць усе арганізацыйныя пытаньні.

АГУЛЬНА - ГАРАДЗКАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ ЯЎРЭЙСКАЙ МОЛАДЗІ

8-га чэрвеня бюро акругкому камсамолу склікае агульна-гарадзкую канфэрэнцыю яўрэйскай моладзі. Канфэрэнцыя абмяркуе пытаньні нацыянальнай палітыкі партыі, вярбоўкі моладзі ў вясковыя школы і даклад рэдакцыі «Юнгер Арбэйтэр».

Бліжэй з масамі

Што паказалі перавыбары бюро цэх'ячэек

Па Барысаўскай гарпартарганізацыі скончыліся перавыбары бюро цэхавых ячэек. У часе перавыбараў некаторыя цэхавыя ячэйкі арганізацыйна перабудаваліся в тэй мэтай, каб пасьля перавыбараў ячэйкі змаглі яшчэ больш ахапіць сваім абслугоўваньнем і працай шырокія рабочыя масы. Так, арганізавана цэхавая ячэйка пры трэцяй зьмене фабрыкі «Чырвоная Бярэзіна», на заводзе імя Домбаля цэх'ячэйка рэарганізавана ў 4 пазьменныя ячэйкі. Гэтыя і рад іншых мерапрыемстваў дадуць магчымасьць ячэйкам стаць у штодзённай рабоце яшчэ бліжэй да мас і разам з імі больш поўна ажыцьцяўляць дырэктывы партыі па сацыялістычным уздыме вытворчасьці.

Перавыбарчыя сходы па цэх'ячэйках паказалі, што ў рабоце парткалектываў слаба ажыцьцяўлялася пастанова ЦК аб тым, каб цэхавым ячэйкам у іх практычнай рабоце надаць больш самастойнасьці. На «Чырвонай Бярэзіне», напрыклад, у адным з цэхаў праводзіліся вельмі важныя мерапрыемствы, а ячэйка гэтага цэху засталася ў баку, ня была ўдзельнікам у правядзеньні гэтых мерапрыемстваў.

У справе кіраўніцтва прафработай у цэху парт'ячэйкам перашкаджае тое, што пры цэхах няма прафбюро, якія-б вырашалі рад пытаньняў у межах дзейнасьці свайго цэху. Той кадр прафупаўнаважаных, які ёсьць па цэхах, фактычна толькі тэхнічны выканаўца фабкомаў. Трэба ЦП саюзаў і ЦПСБ прысьпешыць вырашэньне пытаньня арганізацыі цэхавых прафорганаў у буйнейшых цэхах, іменна тых, якія налічваюць ня менш 150 рабочых.

Трэба дабіцца таго, каб ніводнае важнае мерапрыемства ў цэху не праводзілася бяз ўдзелу цэх'ячэйкі.

Пытаньне аб працы групоргаў да гэтага часу здавальняюча ня вырашана ні ў адной цэх'ячэйцы.

Дрэнна пастаўлена праверка выкананьня пастаноў, што да некаторай ступені паніжае аўтарытэт ячэек.

Галоўнае, чаго трэба дабіцца—гэта ўсямернага ўзмацненьня жывога кіраўніцтва і практычнага паказу. Больш выяўлянь практычных вынікі, скарыстоўваць лепшыя метады работы.

Я. С.

Ня выканалі аскоўнага

Ячэйка КП(б)Б Барысаўскіх савецкіх устаноў ахапляе камуністых, якія працуюць у РВК, пошце, гарсавеце, аддзяленьні Дзяржбанку, нарсудзе і інш. Усяго ў гэтых установах 81 служачы, а партыйцаў—28 чал. На гэту ячэйку райкомам ускладзены абавязак праводзіць работу ў прыгарадных вёсках па арганізацыі беднаты і па растлумачэньні задач партыі сярод сялянства.

З справаздачнага дакладу сакратара ячэйкі і спрэчак на перавыбарчым сходзе відаць, што ячэйка, як савецкая па сваім родзе, са сваімі асноўнымі задачамі спраўлялася слаба. У рабоце ячэйкі галоўнае месца займалі пытаньні агульнага зьместу, пытаньні-ж работы па абслугоўваньні ўстаноў займалі вельмі малое месца. Таму было ва ўстановах рад ненармальнасьцяй. На пошце наглядалася п'янства, растраты, нядбайныя адносіны да работы і г. д. Усе служачыя пошты, у тым ліку і партыйцы пра гэта ведалі, але ячэйку не паведамляялі, і яна не рэагавала на гэтыя зьявішчы.

У працы камітэту ўзаемадапамогі былі выпадкі скажэньняў партыйнай лініі. Камітэт даваў часамі дапамогу заможнікам і гандлярам за кошт дапамогі беднаце.

Па выяўленьні гэтых момантаў бюро ячэйкі ніяк не адважвалася зрабіць з гэтага адпаведныя вывады.

Работа сярод сялянства вакольных вёсак праводзілася не пастаянна, а толькі час ад часу, з надыходам тэй ці іншай кампаніі.

Перавыбарчы сход выкрыў усе недахваты і даў адпаведны наказ новаму складу бюро.

С—цкі.

Да ведама партарганізацый і ячэек КП(б)Б

Для пакрыцьця выдаткаў па чыстцы партыі ўстанаўляецца, пачынаючы з мая м-ца на працягу 6 месяцаў, 20 проц. надбаўкі да вызначаных статутам партыйных членскіх узносаў.

Грошы зьбіраюць ячэйкі і па асобным вучоце перадаюць у касу акругкому.

Нам. кір. справамі ЦК КП(б)Б ЛЕВІН.

Рыбныя багацьці мала выкарыстоўваюцца

Рыбныя арцелі не забясьпечаны прыладамі Каапэрацыя зусім ня цікавіцца рыбным промыслам

Штогадовы дэфіцыт рыбы дасягае ў нас 4.730 тон. Пры належнай арганізацыі справы мы маглі-б поўнасьцю задаволіць нашы патрэбы. Саўгасы і калгасы могуць і павінны дапамагчы пашырэньню рыбагадоўлі

У Беларусі ёсьць вялікія магчымасьці для арганізацыі рыбнай гаспадаркі як у прыродных так і ў штучных вадаёмах. Аб'ектам для гэтага зьяўляюцца 82 тысячы гэктараў вазёр і 32 тысячы кілёмэтраў рэк. Акрамя таго ёсьць каля 2 мільёнаў гэктараў балот, на якіх можна будаваць штучныя сажалкі, практыка пабудовы апошніх ужо дала добрыя вынікі. Выдаткі на выкарыстаньне балот для рыбагадоўлі дасягаюць у сярэднім 150 руб. на гэктар. Чысты прыбытак з гэктару пры правільным вядзеньні рыбнай гаспадаркі ў саўгасах дасягае 50 проц. затрачанага капіталу. Зварот гаспадаркі двухгадовы, што дае магчымасьць хутка вярнуць уложаныя капіталы.

Апрача вялізарных балотных масываў, дзе можна будаваць вялікія рыбныя гаспадаркі, рыбагадоўлю можна таксама арганізаваць у саўгасах, калгасах і ў індывідуальных сялянскіх гаспадарках. Затраты на гэта невялікія і зусім магчымыя ў нашых беларускіх умовах. Найбольш падыходзячым для рыбагадоўлі ў калгасах, саўгасах і сялянскіх гаспадарках зьяўляецца карась і карп, гэтыя пароды рыб хутка растуць і даюць добрыя вынікі.

Рыбагадоўля ў гэтых гаспадарках палепшыць харчаваньне насельніцтва, акрамя таго дасьць магчымасьць вывозіць частку рыбы на гарадзкія рынкі. Разьвіцьцё рыбагадоўлі дае магчымасьць арганізаваць яшчэ адзін прамысел—вязаньне сетак.

Гэты промысел, які ў нас зусім не арганізаваны, можа кожны год даваць працоўнаму насельніцтву каля 100 тысяч руб. Каапэрацыйныя арганізацыі, ня гледзячы на рад заўваг, у гэтай галіне нічога не зрабілі.

Вялікую ролю можа адыграць рыбагадоўля і вязаньне сетак пры арганізацыі яўрэйскіх калгасаў і зямляўпарадкаваньні мястэчак. Гэтыя промыслы пры іх належнай арганізацыі бязумоўна могуць стварыць эканамічную базу для дэклясаванай яўрэйскай местачковай і гарадзкай беднаты. Белазет і Камзет павінны зьвярнуць на гэту справу сваю ўвагу, бо ў нашых беларускіх умовах яна можа набыць вялікае значэньне. Да арганізацыі рыбнай гаспадаркі як у прыродных, так і ў штучных вадаёмах, а таксама і штучнае рыбагадоўлі Наркамзем БССР прыступіў у 1923 г. Зараз у Беларусі ёсьць 2 рыбагадоўчыя заводы (у мяст. Лукомля на Аршанчыне і ў мяст. Гомелі на Полаччыне), па якіх можна выгадоўваць да 100 мільёнаў штук рыбы. Акрамя таго ёсьць 21 паходна-рыбагадоўчая станцыя з прадукцыйнасьцю да 50 мільёнаў штук у часе веснавога лову. Рыбагадоўчыя заводы прыстасаваны для гадоўлі рыбы, якая водзіцца ў іншых мясцовасьцях, але можа акліматызавацца і ў нашых беларускіх умовах. Зараз у Віцебскай акруге на возеры Лосьвіда пачалася пабудова 3-га рыбагадоўчага заводу. Дзейнасьць рыбагадоўчых заводаў ужо дае належныя вынікі. Так, за час з 12-га красавіка па 1-ае мая г. г. на возеры Лукомля было злоўлена 760 чудзкіх сігаў, якія ў стадыі ікры былі прывезены з Чудскага возера і выгадаваны на Лукомльскім рыбным заводзе. Гэта сьведчыць аб добрых умовах вадаёмаў для гадоўлі сігаў.

Спажываньне рыбы ў БССР у 1928-29 г. дасягае прыблізна 28.720 тон, з якіх 14.150 тон прыпадае на свежую рыбу. Валавая прадукцыя прыродных і штучных вадаёмаў БССР дасягае 9.420 тон. Такім чынам, на Беларусі не хапае 4.730 тон рыбы ў год.

Наркамзем зараз ставіць перад сабою задачу па ліквідацыі гэтага дэфіцыту рыбы шляхам штучнае рыбагадоўлі ў прыродных вадаёмах і арганізацыі рыбагадоўлі на мэліяраваных балотах, але каб больш пасьпяхова выканань гэту задачу, трэба пашырыць рыбагадоўлю ў калгасах, саўгасах і індывідуальных сялянскіх гаспадарках. Для каапэрацыі ў гэтай галіне ёсьць шырокае поле дзейнасьці.

Для лоўлі рыбы ў прыродных вадаёмах арганізаваны 62 рыбныя арцелі, якія аб'ядноўваюць 824 членаў.

Але каапэрацыйныя арганізацыі дагэтуль зусім ня цікавіліся гэтымі арцелямі, таму і абслугоўваньне іх пастаўлена вусім дрэнна і надта распылена. Гэтым займаліся, як быццам, і Белсельсаюз і саюз паляўнічых і сампрамсаюз. Але дзе шмат нянек, там дзіця заўсёды бяз носу. Таму зараз ставіцца пытаньне аб аб'яднаньні ўсіх гэтых арцеляй у аднэй каапэрацыйнай арганізацыі—Белсельсаюзе. Для падрыхтоўкі тэхнічнага пэрсаналу, які-б абслугоўваў рыбную гаспадарку, у Мазырскай акрузе пры найбольшым буйной гаспадарцы «Чырвоная Зорка» арганізавана школа рыбагадоўлі, якая кожны год выпускае 30 чалавек. Пры фэрме навукова-дасьледчага інстытуту пачата пабудова дасьледчае рыбнае гаспадаркі, якая і будзе вырашаць дасьледчыя задачы рыбнае гаспадаркі. Акрамя таго пры НДІ вядзецца работа па арганізацыі аддзелу рыбагадоўлі, які будзе займацца распрацоўкай асноў рыбнае гаспадаркі.

На ўсебеларускай выстаўцы сельскае гаспадаркі і прамысловасьці на плошчы ў 50 гэктараў будзе закладзены рыбны гадавальнік, які потым будзе рэарганізаваны ў сталую рыбную гаспадарку. Усе спэцыялістыя рыбнае гаспадаркі павінны зараз-жа пачаць энэргічную падрыхтоўку да ўсебеларускае выстаўкі.

Я. ПАЛЕСКІ.

У суботу, 1 чэрвеня, а 6 гадз. увечары ў памяшканьні клюбу Карла Маркса адкрываецца 2-ая раённая партыйная канфэрэнцыя Фрунзаўскай арганізацыі КП(б)Б.

Парадак дня канфэрэнцыі наступны:
1. Даклад АК КП(б)Б.
2. Справаздача РК КП(б)Б.
3. Справаздача рэв. камісіі.
4. Выбары РК і рэв. камісіі.
5. Выбары РКК.

Модус выбараў на канфэрэнцыю наступны: 1 дэлегат з рашаючым голасам ад кожных 5 сапраўдных членаў партыі і 1 дэлегат з дарадчым голасам ад кожных 7 кандыдатаў партыі.

Мандаты для дэлегатаў канфэрэнцыі выдаюцца ў РК 30, 31-га мая ад 9 да 3 з пал. гадз., 1-га чэрвеня —ад 9 да 12 гадз. дня.

Для атрыманьня мандатаў трэба прадставіць у РК выпіску з пратаколу агульнага сходу ячэйкі аб выбарах на канфэрэнцыю і сьпіс дэлегатаў.

— У суботу, 1-га чэрвеня, а 6 гадзіне ўвечары, у памяшканьні клюбу Розы Люксэмбург (былая чырвоная заля), адкрываецца 2-я раённая партыйная канфэрэнцыя Кастрычнікаўскай арганізацыі КП(б)Б.

Парадак дня канфэрэнцыі наступны: 1) Даклад Мен. акругкому КП(б)Б аб чарговых задачах партыйнай арганізацыі; 2) справаздача аб рабоце райкому КП(б)Б і справаздача рэвізійнай камісіі; 3) выбары райкому, партпройкі і рэвізійнай камісіі.

Мандаты выдаюцца ў РК 29, 30 і 31 мая в 9 да 3 гадз. дня і в 7 да 9 гадз. увечары.

Для атрыманьня мандатаў патрэбна прадставіць у РК выпіску з пратаколу агульнага сходу ячэйкі аб выбарах на канфэрэнцыю і сьпіс дэлегатаў.

Не варочайце аблігацыі дзяржаве

Арганізуйце спаборніцтва на 100 проц. трыманьне аблігацый пазык на руках працоўных і здачу аблігацый на калектыўнае хаваньне

(На нарадзе камісій садзейнічаньня распаўсюджаньню пазык сумесна з рэдкалегіямі насьценгазэт г. Менску)

У пятніцу, 24 мая, у клюбе саўгандальслужачых адбылася нарада камісій садзейнічаньня распаўсюджаньню дзяржаўных пазык сумесна з рэдкалегіямі насьценгазэт. Даклад па пытаньні аб трыманьні аблігацый пазык індустрыялізацыі на руках зрабіў тав. **Вострыкаў.**

Камісіі садзейнічаньня „адпачываюць"

— Раней чым склікаць гэту нараду,—кажа дакладчык,—былі абсьледаваны 23 калектывы. Што паказала абсьледваньне?

У большасьці абсьледаваных калектываў пасьля правядзеньня падпісной кампаніі ніякая праца не вялася. Толькі ў пяці калектывах ставіліся даклады, пісалася ў насьценгазэтах аб выніках кампаніі і далейшых задачах крэдытнае працы. Толькі адна камістія (пры ЦК КП(б)Б) арганізавала **«кутох дзяржпазыкі»**, у якім акрамя плякатаў сабраны ўсе спраўкі па пазыках і адпаведная папулярная літаратура.

Некаторыя камісіі (зав. **«Камунар», шчотачная фабрыка**) арганізавалі дзяжурствы сваіх членаў з мэтай даваць спраўкі трымальнікам аблігацый. Вось прыблізна ўсё тое станоўчае, што выявіла абсьледваньне.

Абсьледваньне паказала, што партыйныя ячэйкі і фабзаўмясцкомы не кіравалі працай камісій. На такім заводзе, як **«Бальшавік»**, ячэйка і заўком амаль ня ведалі, што існуе камісія садзейнічаньня пасьля правядзеньня падпіскі. Тут, вразумела, выявілася пасьпяшасьць і саміх камісій, якія, пад час, і рады былі, што іх ніхто не варушыць. Не малую віну за гэту пасьпяшасьць мы ўскладаем і па насьценгазэты. Трэба прызнаць, што рэдкалегіі, якія павінны зьяўляцца арганізатарамі і штурхачамі па усіх галінах заводзкага жыцьця, самі «праспалі» гэту работу. І гэта ў той час, калі на многіх прадпрыемствах частка рабочых ня ведае мэты нашых пазык, ня ведае выразна, куды ідуць грошы, якія дзяржава пазычае ў пасельніцтва. На гэта пытаньне некаторыя проставушна адказваюць: «патрэбны дзяржаве грошы, вось яна і пазычае». І ўсё! А куды канкрэтна ідуць гэтыя грошы—на гэта пытаньне дакладнага адказу не даюць.

Насьценгазэты не зразумелі сваіх задач

Вось чаму тав. **Вострыкаў** прымушан быў больш спыніцца на растлумачэньні самой прыроды нашых пазык наогул і пазык індустрыялізацыі ў прыватнасьці. Парт'ячэйкі, фабзаўмясцкомы і камісіі садзейнічаньня зараз-жа павінны распачаць растлумачальную кампанію ў сваіх калектывах па пытаньні трыманьня аблігацый пазык на руках. Гэта тым больш неабходна, што набліжаецца тэрмін выплаты апошніх узносаў за аблігацыі 2-ое пазыкі індустрыялізацыі, калі будуць выдаваць аблігацыі на рукі. У гэтай кампаніі павінны прыняць самы актыўны ўдзел насьценгазэты. Для насьценгазэт баявая задача—разгарнуць канкрэтную працу па пытаньні трыманьня аблігацый пазык на руках. Кожная рэдкалегія павінна распачаць працу пад лёзунгам: **«хто закладае аблігацыі пазыкі, той зрывае індустрыялізацыю краіны».**

Рэдкалегіі павінны павесьці ўпартую растлумачальную працу сярод таварышоў іх калектыву, якія яшчэ не ўсьвядомілі сутнасьці нашае крэдытнае сыстэмы. Кожнаму таварышу неабходна ведаць, што на яго грошы, якія ён пазычыў дзяржаве, ужо закуплены машыны для нашых заводаў і, калі забіраць ад дзяржавы свае пазыкі назад да пэўнага тэрміну, гэта значыць **зрываць пляны будаўніцтва новых заводаў.** Кожны рабочы, служачы павінен ведаць, што новыя фабрыкі і заводы нясуць нам праз некалькі год паляпшэньне дабрабыту і робяць нашу краіну незалежнай ад капіталістычных краін.

Разам з гэтым,—гаворыць далей дакладчык,—неабходна павесьці рашучую барацьбу з хлусьлівымі чуткамі, нібы дзяржава хоча адмовіцца ад свайго абавязку прымаць аблігацыі пад заклад. Дзяржава ніколі не адмовіцца ад гэтага свайго абавязку. Але мы павінны разьмяжоўваць факты закладаў аблігацый. Калі працоўны прымушаны закладаць аблігацыі ў выпадку якога-небудзь няшчаснага здарэньня і калі яму неабходна ў такім выпадку матар'яльная дапамога, такога таварыша мы не павінны папракаць за яго ўчынак. Але такіх фактаў мала і яны ня могуць быць масавымі, таму яны нас і ня трывожаць. Зусім іншае, калі таварыш закладвае аблігацыі без патрэбы, а так сабе, каб набыць сабе хатнюю маемасьць, без якое ён можа пэўны час абыйсьціся, ці набыць яе іншым шляхам (крэдыт ЦРК, эканоміі).

Правесьці растлумачальную работу сярод жонак

У спрэчках па дакладу выказалася шмат таварышоў, якія не таілі сваёй віны ў тым, што не вялі растлумачальнае працы сярод сваіх калектываў. Выступаўшыя ўносілі і канкрэтныя прапановы.

— Я зьвяртаю ўвагу,—кажа т. **Айзенштадт** (працкалектыў пекараў).—што па закладзе і продажы аблігацый самыя «актыўныя» гэта нашы жонкі. Жонка часта «агітуе» мужа прадаць аблігацыі і купіць лішняе ўбраньне ці новы ложак і г. д. Яны часта гэта робяць па несьвядомасьці. Вось, напрыклад, і мая жонка меркавала ўжо што-небудзь набыць за аблігацыі. А як пачалі гаварыць, што прадаваць аблігацыі нельга, што гэта грамадзкае злачынства, яна ні за што не прадае сваіх аблігацый. Я прапаную склікаць сход жонак, на якім паставіць пытаньне аб трыманьні аблігацый на руках. Надалей гэта трэба праводзіць сыстэматычна.

Прапанову тав. **Айзенштадта** нарада падтрымала аднадушна.

— Растлумачальная праца за трыманьне аблігацый на руках,—кажа адзін з выступаўшых,—па сутнасьці ёсьць праца **за пасьпяховае выкананьне пяцігадовага пляну гаспадарчага будаўніцтва.**

* * *

Нарада прыняла рад прапаноў:

а) правесьці агульныя сходы, гутаркі з рабочымі, служачымі і чырвонаармейцамі на тэму аб значэньні дзяржпазык;

б) арганізаваць калектыўную здачу аблігацый ў крэдытныя ўстановы на хаваньне. Гэта мерапрыемства гарантуе своячасовасьць праверкі і атрыманьня выйгрышаў;

в) пры дапамозе крэдытных устаноў арганізаваць **«Куткі дзяржпазык»;**

г) арганізаваць спаборніцтва паміж камісіямі за найбольш поўнае трыманьне аблігацый на руках і здачу іх на хаваньне;

д) камісіям садзейнічаньня ФЗМК, пасьценкорам і рабкорам шырока скарыстоўваць насьценгазэты і друк для адлюстраваньня ходу кампаніі;

е) практыкаваць са згодаю выйгрэўшых трымальнікаў пазык калектыўную выплату выйгрышаў ва ўрачыстай абстаноўцы;

ж) прасіць усе клубы саюзаў уключыць у плян сваёй працы ня менш як па 2-3 асобныя вечары **«пытаньняў і адказаў** па дзяржкрэдыце і ашчаднай справе»;

з) перад мастацкімі выступленьнямі ў клюбах (на працягу 10-20 хвілін) рабіць даклады аб тым, каб трымальнікі пазык устрымліваліся ад продажу аблігацый;

і) акрфа і крэдытныя установы забясьпечыць прадпрыемствы, установы і вайсковыя часьці дакладчыкамі і наладзіць сувязь з камісіямі садзейнічаньня.

П. ІЗОХ.

Пара думаць аб асеньняй сяўбе

УРАДЖАЙ БУДУЧАГА ГОДУ У ЗНАЧНАЙ МЕРЫ БУДЗЕ ЗАЛЕЖАЦЬ АД ТАГО, НАКОЛЬКІ ПАСЬПЯХОВА МЫ ПРАВЯДЗЕМ ПАДРЫХТОЎКУ ДА АСЕНЬНЯЙ СЯЎБЫ

Пашырэньне пасеўнай плошчы, калектывізацыя, аграмінімум і дапамога беднаце—асноўныя пытаньні падрыхтоўчай работы

I. Вынікі веснавой пасеўнай кампаніі

Падрыхтоўчы пэрыяд да веснавой сяўбы значна даўжэйшы за асеньні. Таму зараз, калі веснавая сяўба толькі яшчэ закончваецца, зусім своячасова ставіць пытаньне аб падрыхтоўцы да асеньняй сяўбы. Да гэтага абавязвае нас параўнальна кароткі падрыхтоўчы пэрыяд, супадзеньне падрыхтоўчых работ з работамі па ўборцы ўраджаю і, нарэшце, практыка, старая практыка, якая папярэджвае клапаціцца аб чым трэба не тады, калі на паляваньне асьці.

Зусім зразумела, што для правільнай падрыхтоўкі да асеньняй сяўбы трэба ведаць вынікі праробленай работы ў часе пасеўнай кампаніі. Вынікі павінны паказаць нам нашы плюсы і мінусы, а таксама і паказаць вузлавыя моманты нашай работы на летні і асеньні пэрыяд.

Канчатковых лічбовых паказальнікаў вынікаў веснавой сяўбы і праведзеных мерапрыемстваў мы яшчэ ня маем. Адсутнічаюць у нас як колькасныя, так і якасныя паказальнікі. Мець іх мы будзем у бліжэйшыя два тыдні. Але зараз, тым ня менш, асноўныя моманты як станоўчыя, так і адмоўныя выяўляюцца зусім ясна.

У ліку станоўчых момантаў першым ідзе масавасьць падрыхтоўчай работы. У гэтую вясну нам удалося ўпяршыню дабіцца ўдаелу ў рабоце земорганаў шырокіх мас сялянства, прычым у такіх разьмерах, якія да гэтага часу зьяўляліся нябачнымі. Гэтаму дапамагаў цэлы рад акалічнасьцяй. У першую чаргу выявілася рашучая ўстаноўка камуністычнай партыі і савецкай улады адносна шырокага разгортваньня сацыяльна-тэхнічнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі ў зьвязку са сканчэньнем адбудоўчага пэрыяду.

Зьезды па пытаньнях ураджайнасьці, канфэрэнцыі, нарэшце, тысячы сялянскіх сходаў, якія дакладна абгаворвалі пытаньні калектывізацыі, каапэраваньня, падняцьця ўраджайнасьці, законы саюзнага і беларускага ўраду—усё гэта настолькі моцна акумулявала энэргію сялянскіх мас, што падрыхтоўка да веснавой сяўбы набыла характар сапраўды грандыёзнага паходу за ўраджай. Сярод агранамічнага пэрсаналу ўдалося дабіцца пералому як у ацэнцы сваёй ролі, так і ва ўсьведамленьні задач, што стаяць перад савецкім агранамам у даны пэрыяд. Аграномы ў большасьці сваёй зразумелі, што весьці работу па паляпшэньні асобных сялянскіх гаспадарак, гэта ня толькі займацца бескарысным земскім «подвижничеством», але і тармазіць рэканструкцыю сельскае гаспадаркі. Трэба браць аб'ектам увагі і работы шырокіх масы сялянскіх гаспадарак. На гэты шлях у гэтую вясну стала канчаткова большая частка беларускай агранамічнай арганізацыі.

Зямельныя органы ў значнай частцы вызваліліся ад тэй коснасьці і непаваротлівасьці, якая была ўласьціва ім. Паасобныя акруговыя і раённыя ўстановы паказалі дасканалыя ўзоры як зьместу, так і тэмпу работы.

Грамадзкія арганізацыі ў вёсцы і горадзе (камсамол, шэфарганізацыі, прафсаюзы, працземлес і працасьветы) прынялі шырокі ўдзел у пасеўнай кампаніі ня толькі агітацыяй, літаратурай, але аказалі значную вытворчую дапамогу асабістаю працаю, машынамі, рамонтам інвэнтару і г. д.

Калектывізацыя, ня гледзячы на рад недахватаў, што вынікаюць са спэцыфічных беларускіх умоў, праходзіць як шырокае масавае зьявішча, прычым у гэтую вясну ўдалося дабіцца стварэньня раду буйных калгасаў (па 1.000 і больш гэктараў).

Забесьпячэньне сродкамі вытворчасьці (машыны, мінэральныя ўгнаеньні, насеньне, крэдыт) параўнальна з мінулым годам было значна павялічана. Сацыялістычны сэктар сельскае гаспадаркі быў забясьпечаны сродкамі вытворчасьці амаль на 100 проц. патрэбы.

Значна ўзрасла агрыкультурная роля і практычны ўплыў у гэтай галіне на сялянскія гаспадаркі з боку калгасаў і саўгасаў. Асабліва заўважваецца гэта ў адносінах савецкіх гаспадарак, якія да цяперашняй вясны свае агрыкультурныя абавязкі выконвалі дрэнна, казённа, бюракратычна.

Прасьцейшыя агратэхнічныя мерапрыемствы ў гэту вясну атрымалі шырокае распаўсюджаньне. Ачыстка насеньня, пратручваньне, збор і скарыстаньне попелу далі здавальняючыя вынікі. У выстарчальнай ступені напулярызавана ідэя абавязковага аграмінімуму і шчыльна як земоргановы, так і сялянства, падыйшлі да пытаньня скарыстаньня мясцовых рэсурсаў і сродкаў.

Друк (цэнтральны) своячасова разгарнуў работу па падрыхтоўцы да веснавой сяўбы, дапамог арганізаваць масы і досыць удала змагаўся з расхлябанасьцю зямельнага і каапэрацыйнага апарату.

На фоне гэтых станоўчых момантаў у правядзеньні веснавой сяўбы яшчэ больш востра выступаюць недахваты. Мы спынімся толькі на галоўнейшых з іх.

Непадрыхтаванасьць зямельнага і каапэрацыйнага апарату да скарыстаньня энэргіі, зацікаўленасьці ўздыму мас лепш за ўсё выявілася ў гэтую зіму і вясну. Востра адчувалася спазьненьне: спазьняліся **са складаньнем пляну**, з завозам машын і прылад, з разьмеркаваньнем крэдытаў, з правядзеньнем кантрактацыі, з разгортваньнем ачыстки насеньня, рамонтам машын і г. д. Слова ім было такога мерапрыемства, дзе-б бязьдзейнасьць і нядбайнасьць апарату не давала сябе адчуваць у тэй ці іншай меры. У мінулыя гады ўсе гэтыя зьявішчы таксама былі. Але зараз неабходнасьць працаваць паповану, уздым мерапрыемстваў і задачы патрабавалі новых тэмпаў у рабоце і зусім іншых адносін з боку зямельных і каапэрацыйных органаў.

Для першага пэрыяду падрыхтоўчых работ характэрна таксама **слабое кіраўніцтва з боку акруговых і раённых партыйных арганізацый.** Партыйныя камітэты толькі ў другім пэрыядзе (непасрэдна перад сяўбой) здолелі даць належны тон у рабоце і прыцягнуць увагу ўсіх членаў партыі да пытаньняў веснавой пасеўнай кампаніі.

Амаль зусім не адчувалася арганізатарская роля нізавога савецкага апарату. Сельсаветы і райвыканкомы не адчувалі сябе адказнымі за стан сельскае гаспадаркі ў раёне іх дзейнасьці. Сельска-гаспадарчыя камісіі пры сельсаветах і раённыя сельсаветы амаль бязьдзейнічалі. Але, ня гледзячы на шырокі размах мерапрыемстваў і актыўны ўдзел мас, сельгаскамісіі пры сельсаветах яшчэ ня сталі вытворчымі нарадамі па пытаньнях сельскае гаспадаркі.

Работа па вытворчым каапэраваньні падняцьця сельскае гаспадаркі праводзілася вельмі дрэнна. У выніку мы маем на 1 мая выкананьне гадавога пляну па каапэраваньні на 40 проц. і моцнае недавыкананьне пляну каапэраваньня па пасял

Там, дзе беларусізацыю праводзяць машыністкі

даволі красамоўных рэзалюцый і пажаданьняў, даволі няньчыцца з сабатажнікамі беларусізацыі

—ім ня месца ў нашым апараце

Парт'ячэйкі і прафсаюзы—больш адказнасьці за нацработу

Па БССР

Падрыхтоўка да с. г. падатковай кампаніі

ВОРША. (Наш кар.). У акрузе распачалася праца па вучоце аб'ектаў па абкладаньні с.-г. падаткам на 1929-30 год. Растлумачальная праца ўжо праведзена ў часе падрыхтоўкі да веснавое сяўбы. Падлічаны кулацка-заможныя гаспадаркі, якія падлягаюць ападаткаваньню ў індывідуальным парадку. Усяго па акрузе такіх гаспадарак адабрана 1.429 ці 1,5 процантаў да агульнага ліку ўсіх сялянскіх гаспадарак акругі, а ў мінулым годзе 0,45 проц.

З усіх вызначаных для індывідуальнага ападаткаваньня гаспадарак 36,8 процантаў стала карыстаюцца наёмнаю працоўнаю сілаю, 42,3 проц. маюць батраку на сэзон і 20,9 проц. маюць захаваны гандаль, прадпрыемствы і інш.

Сярод гаспадарак, што падлягаюць індывідуальнаму ападаткаваньню, вначыцца гаспадарка аднаго старшыні сельсавету, Круглянскага раёну. Гэты старшыня—кулачок ужо выключаны з членаў сельсавету.

Пры адборы кулацкіх гаспадарак вясковая беднота правяла вялікую актыўнасьць і дапамагла вывяліць усіх заможных гаспадароў і кулакоў.

Дапамога беднаце

ВОРША. (Наш кар.). Акрвыканком перадаў Чарэйскаму раёну, дзе ў мінулыя гады быў недарод хлеба, 800 рублёў, атрыманых ад продажу сэквэстраванага госу. на закупку насеньня для беднаты.

Акрсельсаюзу запрапанавана забясьпечыць Чарэйскі райвыканком на гэту суму насеньнем.

104 новыя спэцыялісты

Магілеў. (Наш кар.) Адбыўся другі выпуск Магілеўскага земляўпарадчага тэхнікуму. Усяго скончыла сёлета тэхнікум 104 чалавекі.

Студэнцтва і настаўніцтва тэхнікуму паслала прывітальныя тэлеграмы ЦК КП(б)Б і ЦВК Беларусі, у якіх запэўніе, што скончыўшыя тэхнікум 104 новыя спэцыялісты аддадуць усе свае сілы і вопыт на сацыялістычную перабудову нашай краіны і будуць шчыра працаваць пад сьцягам камуністычнае партыі і савецкае ўлады.

За сувязь з кулацтвам

КАПЫЛЬ. (Наш кар.). Загадчык грашовай часткі Капыльскага РВК Паўла Гурскі трымаў сувязь з кулацтвам ў раёне і п'яствраваў. У вёсцы Сьвінкі ён пахаўрусаваў з кулаком і самагонщыкам Пятрусём Пархімовічам, якому даваў парады, як утаіць злачынства.

Калі ў народным судзе павінна была разгядацца справа брата Гурскага Васіля, то Гурскі напаіў сакратара суду Суната, і прыгавар быў вынесены на карысьць Васіля Гурскага.

Акрамя таго Гурскі прадаў 6 дзесяцін зямлі Бельмачу. Гурскі атрымліваў у спажывецкай каапэрацыі гроші, якія прапіваў і траціў на свае патрэбы.

Разам з Гурскім у папойках удзельнічалі старшыня Слабода-Кучынскага сельсавету Карпук і сакратар Кандыбовіч.

Выязная сэсія Менскага акруговага суду ў Капылі прыгаварыла Паўла Гурскага за ўсе гэтыя злачынствы на тры гады зьняволеньня з суровым адмежаваньнем, пакараціўшы яму кару па амністыі на палавіну.

Карпуч і Кандыбовіч вінны в работы ў сельсавеце. Акрамя таго ім забаронена займаць пасады ў дзяржаўных і каапэрацыйных установах на працягу двух год. Бельмач за куплю зямлі аштрафаваны ў карысьць дзяржавы.

Сродкі ад самаабкладаньня на добрабыт вёскі

ВОРША. (Наш кар.). Сёлета па акрузе паступіла 286.833 руб. сродкаў па самаабкладаньні ці 86 процантаў ад агульнае оумы.

111.300 руб. з гэтых грошай ужо выданы на пабудову больніц, школ і набыцьцё пажарных машын для вясковых дружын. Рэшта грошай ад самаабкладаньня прызначана на будаўніцтва, якое вэзра распачынаецца.

Пуск новага цагельнага заводу

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.) Скончана будаўніцтва новага цагельнага заводу. Зараз ужо пачалася фармоўка цэглы з тым, каб у гэтым сэзоне выпусьціць да 2-х мільёнаў штук цэглы. Па заводзе пабудаваны інтэрнат для рабочых, лазьня, памяшканьне для чырвонага кутка, сталоўкі і каапэрацыйнай крамы.

Па канцылярыях і габінэтах

У апошнія дні цэнтральнай пацкамісіяй быў праведзен рад абсьледваньняў апаратаў цэнтральных установаў, як яны направілі хібы у беларусізацыі, якія былі адзначаны ранейшымі праверкамі.

Абсьледваньне паказала, што тэмп беларусізацыі далёка невыстарчальны, справа беларусізацыі пастаўлена фармальна, «беларусізуюць», праўдзівей вырубаюць апаратчыкаў толькі машыністкі сваімі перакладамі.

У Дзяржпляне ўся тэхнічная праца апарату беларусізавана на 90-95 проц. Але зусім не беларусізавана праца кан'юнктурнай сэкцыі. Даклады і іншыя складаныя матар'ялы пішуцца выключна на расійскай мове па тэй прычыне, што ніводзін працаўнік спэцыялістыня ведае беларускай мовы. Гутаркі, даклады на пасяджэньнях сэкцыі і на прэзыдыуме вядуцца на расійскай мове. Усе выданьні як «Савецкае Будаўніцтва», «Кан'юнктура» і «Кантрольныя лічбы», „Націгодка" амаль выключна на расійскай мове.

У ЦСУ справа з беларусізацыяй усё яшчэ не стаіць на належнай вышыні. Слаба зусім беларусізавана канцылярыя ЦСУ. Пратаколы калегіі статыляну на 100 проц. вядуцца на расійскай мове. Усе формы, бланкі статыстыкі, за некаторым выключэньнем,—усе на расійскай мове. Кіраўнікі сэкцый тлумачаць гэта тым, што такая форма патрэбна для ЦСУ Саюзу ССР.

Даклады, гутаркі як на пасяджэньнях, сходах, так і ў штодзённым жыцьці вядуцца выключна на расійскай мове. Праца грамадзкіх арганізацый вядзецца ў большасьці таксама на расійскай мове. Так, напрыклад, у насьценгазэце большасьць артыкулаў на расійскай мове. Абвесткі мясцкому—таксама на расійскай мове.

У Лесбеле значную частку супрацоўнікаў складаюць спэцыялістыя, сярод якіх толькі некаторыя трохі ведаюць беларускую мову і пішуць пабеларуску невялічкія паперкі. Але асноўная частка спэцыялістых беларускай мовы ня ведае і праяўляе нежаданьне беларусізавацца. Рэшта супрацоўнікаў (не спэцыялістыя) больш-менш беларускую мову ведае і вядзе працу на беларускай мове. Паміж сабою супрацоўнікі беларускай мовы ня ўжываюць.

Скуртрэст амаль цалкам беларусізаваны з 1927 г. Усе супрацоўнікі трэсту займаліся ў гуртку па вывучэньні беларускае мовы і зараз ёю ўладаюць. Выключэньнем зьяўляюцца спэцыялістыя, якія і зараз яшчэ не перайшлі ў сваёй працы на белмову.

У Харчтрэсьце амаль такое-ж становішча. Тэхнічны пэрсанал вядзе перапіску выключна на беларускай мове, а спэцыялістыя—на расійскай.

Як заўважана пры абсьледваньні, справа беларусізацыі ў большасьці ўстаноў пастаўлена фармальна. Вінаваты ў гэтым кіраўнікі ўстаноў, якія сурёзна і сыстематычна не праводзяць беларусізацыю сваіх устаноў. Вельмі часта бываюць выпадкі, калі войдзеш да кіраўніка якой-небудзь установы, ён з табою пачынае гаварыць расійскую, але калі адкажаш пабеларуску, кіраўнік таксама пераходзіць на беларускую мову, якую добра ведае.

Што датычыць спэцыялістых, дык зусім правільна пастанова акруговай пацкамісіі, у якой адзначаецца, што вінавата прафсаюзная арганізацыя, якая нічога не зрабіла, каб узмацніць праведзеньне беларусізацыі сярод сваіх членаў.

А.

Адны даклады і пастановы

Камісія Фрунзаўскага райкому КП(б)Б па праверцы беларусізацыі ў раёне падагуліла вынікі праверкі. Яны гавораць аб тым, што большасьць ячэек ня выканала дырэктыў партыі ў справе беларусізацыі, а некаторыя нават зусім ня імкнуцца што-небудзь у гэтым напрамку рабіць.

Здавалася-б, што тыя ячэйкі, адносна якіх райком у сваёй пастанове ў мінулым годзе адзначыў, што яны мала зрабілі ў галіне беларусізацыі, павінны былі ў гэтым годзе быць прыкладнымі. Але па справе мы бачым зусім адваротнае. Як і ў мінулым годзе яны практычна мала чаго зрабілі. Выносяць красамоўныя рэзалюцыі па дакладах аб нацпытаньні, даюць дырэктывы, а правяраць дырэктывы забываюцца.

Пяройдзем да фактаў. У вывадах камісіі мы знаходзім такі пункт: «... Белдзяржтандаль. З камуністых мову ведаюць усе, але ніхто яе ня ўжывае. Супрацоўнікі ўстановы, за выключэньнем аднаго інжынэра, таксама ведаюць мову, але ёю ніхто не карыстаецца. Уся перапіска, за выключэньнем дробных паперак,—на расійскай мове».

Такое становішча мы маем у ячэйцы і апараце ўстановы цэнтральнага маштабу. Ці выканана хаця колькі-небудзь дырэктыва аб беларусізацыі ячэйкі і нераводзе ўсе работы ўстановы на беларускую мову?

Бязумоўна, ня выканана!

А вось і Лесбел 23-га сакавіка г. г. ячэйка праверыла веды беларускай мовы, а заслухаць вынікі на бюро забыліся. На партсходах, за выключэньнем сакратара ячэйкі, ніхто не гаворыць пабеларуску.

Ёсьць і такія ячэйкі (Дзяржсьпірт і Белкартрэст), дзе апорг нават ня ведае, на якой мове выдаецца насьценгазэта.

Трэба шчыра прызнацца, што большасьць ячэек абмяжоўваецца толькі пераводам усяе тэхнічнае работы ячэйкі на беларускую мову і лічыць, што іх місія гэтым скончана.

ЗАГАДЧЫКІ НЯ ЎМЕШВАЮЦЦА

Мы маем і такія зьявішчы, што калі ячэйкі хочуць нешта зрабіць, дык кіраўнікі ўстаноў ім не дапамагаюць.

Прачытайце рэзалюцыю агульнага партыйнага сходу ячэйкі Наркамгандлю, якая аб'яднае некалькі ўстаноў, і знойдзеце такія факты: «... кіраўнікі ўстаноў (Тэкстыльгандаль, Продасілікат, Тэжэ і Гумтрэст) парушылі пастанову аб тэрміне пераводу апарату на белмову і да пераходу на белмову не падрыхтаваліся». І далей «з боку кіраўнікоў Наркамату (справа ідзе аб Наркамаце Гандлю. М. Ш.) ня прымаюцца належныя меры да скаччэньня беларусізацыі апарату.

І ТУТ КЕПСКА

Пры наўпэнасьці такога становішча ў савецкіх ячэйках мядзіва, калі вытворчыя ячэйкі мала што зрабілі ў гэтым напрамку. Тут мы часта наглядаем неразуменьне важнасьці ўкараненьня пралетарска-беларускай культуры ў быт рабочага. Адсюль і такі факт: працкалектыў тэкстыльшчыкаў, які аб'ядная 350 рабочых, выпісвае «Зьвязды» ўсяго 5 экзэмпляраў. У гэтай-жа ячэйцы ніадзін з камуністых не гаворыць пабеларуску.

Можна для прыкладу ўзяць і такія ячэйкі, як першая друкарня і друкарня «Зьвязды», дзе людзі па 8 гадзін у дзень працуюць над наборам беларускай газэты, часопісі і кнігі, а мовы ня ведаюць. Праверка беларусізацыі ў гэтых дзьвёх друкарнях паказала, што мову ведае 40 проц. камуністых, а ўжывае яе толькі 10 проц. З 450 рабочых першай друкарні, з якіх 109 камуністых, беларускія газэты выпісвае толькі 13 чалавек. Чаму гэта так? Таму, што парт'ячэйкі беларусізацыяй ня кіруюць.

А вось і другія зьявішчы. Ячэйка нархарч яднае больш 2.000 работніц і служачых. Ёсьць вялікая патрэба ў беларускай мастацкай літаратуры, а яе ў клюбе не хапае.

БОЛЬШ СУР'ЁЗНА ЎЗЯЦЦА ЗА СПРАВУ

Вось невялікі малюнак па некаторых праверваных ячэйках. Вынікі ня зусім добрыя. Кожная ячэйка, не чакаючы камісіі райкому, павінна яшчэ і яшчэ раз праверыць, што зроблена ў галіне беларусізацыі. Трэба абавязаць усіх камуністых, якія ведаюць беларускую мову, ужываць яе ў штодзённым жыцьці, а кіраўнікі ўстаноў павінны выканаць дырэктывы партыі і ўраду аб беларусізацыі апарату і ў першую чаргу паказаць самім прыкладам.

Пытаньне аб беларусізацыі трэба ставіць зараз канкрэтна. Пара перайсьці ад дакладаў і рэзалюцый да практычнага ажыцьцяўленьня дырэктыў па нацпытаньні.

МІХ. ШМІДТ.

Недапушчальная нядбайнасьць

цэрахгўскіх партыйных і савецкіх арганізацый

З матар'ялаў Гомельскай акруговай камісіі па праверцы становішча беларусізацыі ў Цэрахаўскім раёне відаць, што цэрахаўцы, або не зразумелі, або ня хочуць разумець сутнасьці нацыянальнай палітыкі нашай партыі і ўраду, і таго вялікага палітычнага значэньня, якое мае далучэньне Гомельшчыны да БССР.

У розных раённых установах зусім не адчуваецца, што гэтыя ўстановы знаходзяцца ў Беларусі.

Матар'ялы праверкі яскрава сьведчаць аб тым, што кіраўнікі ўстаноў належных захадаў па беларусізацыі свайго апарату ня прымалі. Ня было ніякага нагляду за працай гурткоў па вывучэньні мовы, якія былі арганізаваны амаль пры кожнай установе, ніхто ніякай адказнасьці за працу гэтых гурткоў не нясе.

З праверваных камісіяй 64 адказных раённых працаўнікоў, мову ведаюць здавальняюча толькі 16, а іншыя зусім не ня ведаюць. Растлумачальная праца аб значэньні нацпалітыкі і беларусізацыі сярод супрацоўнікаў розных устаноў амаль што не праводзілася. Праца ня толькі вясковых, але і раённых устаноў да апошняга моманту амаль што цалкам праводзіцца на расійскай мове. Райком КП(б)Б да апошняга часу ніякіх мер уплыву на кіраўнікоў устаноў у сэнсе правядзеньня беларусізацыі ня прымаў.

Асабліва дрэнна стаіць справа з вывучэньнем мовы сярод партыйцаў. Праўда, пытаньне аб правядзеньні нацпалітыкі і ў прыватнасьці беларусізацыі свалчасова было завострана перад ячэйкамі. Але-ж даная дырэктыва па ячэйках ніводнага разу Райкомам не правярялася і ячэйкамі ня выканана.

Ня гледзячы на тое, што значная большасьць насельніцтва гаворыць на беларускай мове, уся партарганізацыя і нават тыя таварышы, якія добра ўладаюць белмовай, на ўсіх сходах у штодзённай працы карыстаецца расійскаю моваю, што зусім недапушчальна. З 113 чалавек агульнага ліку ўсёй партарганізацыі раёну, добра ведаюць мову каля 10-ці чалавек, здавальняюча каля 5 чалавек, астатнія 98 чал. зусім ня ведаюць і ня вывучаюць яе. Пытаньне аб правядзеньні беларусізацыі шырокіх колаў насельніцтва і аб вывучэньні беларускай мовы партыйцамі абгаварвалася на адным толькі разу на сходах: Перастаўскай, Ленінскай і Маркавіцкай ячэйк, а ў Цэрахаўскай, якая знаходзіцца над самым носам райкому і налічвае 33 чал. членаў і кандыдатаў партыі, Калінінскай, Васілеўскай, Н. Крупецкай, Н. Пуцкай і іншых, гэтыя пытаньні на парадку дня ніколі не станлі.

У камсамоле справа з беларусізацыяй стаіць ня лепш. З чатырох з паловаю сот камсамольцаў, з якіх складаецца раённая арганізацыя камсамолу, за выключэньнем невялічкай часткі камсамольцаў-настаўнікаў, амаль ніводзін камсамолец ня ведае хоць-бы здавальняюча белмову. Трэба адзначыць, што сярод часткі ня толькі камсамольцаў, але нават і партыйцаў наглядаюцца досыць адкрытыя, вяліка-расійскія шавіністычныя настроі, ня толькі нядбайныя адносіны да вывучэньня белмовы, але і варожыя адносіны да яе. Тое самае і сярод часткі настаўніцтва. Абсьледваньне працы школ сацвыху высьвятліла, што такія настаўнікі і настаўніцы, як Касьпірава (Прудоўская школа), Самініч (Пракопаўская школа), Гашкевіч (Чарацянская школа) (такіх у раёне ёсьць вялікая колькасьць), якія працуюць па тры гады на беларускай мове, самі яе ня толькі ня ведаюць, але і ня цікавіцца яе вывучэньнем. Зразумела, што ва ўсіх такіх школах дзяцей ня вучаць, а калечаць. Можна было-б яшчэ падаць цэлы рад прыкладаў, якія характарызуюць становішча беларусізацыі ў гэтым раёне і бюракратычныя адносіны да выканаьня дырэктыў вышэй стаячых органаў.

Дрэннае становішча з беларусізацыяй ў раёне сьведчыць, што сярод церахаўскай партарганізацыі ня выстарчальна растлумачаны задачы нацпалітыкі.

З боку кіруючых органаў раёну зусім адсутнічае жаданьне заняцца сапраўднай працай па беларусізацыі.

М. СЬВЯТЛОВІЧ.

Колькі рабочага часу гіне дарма

Першыя вынікі хранамэтражу на пабудове унівэрсытэцкага гарадка паказалі адсутнасьць увязкі некаторых працэсаў работы, адсутнасьць рацыянальнага скарыстаньня часу і рабочай сілы. —Рабочыя і тэхнічны пэрсанал павінны зьвярнуць больш увагі на рацыяналізацыю работ.

Калі на фабрыцы, на заводзе машына дысцыплінуе рабочага досыць рэгулярна падаваць сырэц ці паўфабрыкат, каб забясьпечыць карыснае запаўненьне рабочага часу, дык на будаўніцтве, калі амаль уся работа праводзіцца ручным спосабам, у справе забесьпячэньня поўнай карыснай нагрузкі рабочага дни важнейшую ролю адыгрывае наладжанасьць работы, узгадненьне паміж сабою пазсобных працэсаў, своячасовая падача матар'ялаў, правільнасьць рабочых чарцяжоў і ўсяго таго, што датычыць правільнага разьмеркаваньня рабочай сілы і рацыянальнай арганізацыі работ з боку адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу.

Першая практыка хранамэтражных нагляданьняў за ручным гнуцьцём жалеза арцельлю арматурщыкаў з 16 чалавек на пабудове унівэрсытэцкага гарадка дала наступныя вынікі: на працягу трох дзён процант сапраўднай работы складаў 58, процант прастояў—23 і процант прагулу ў часе работы—20.

Прастой азначае тут час, праведзены рабочымі дарма, з-за адсутнасьці рабочых чарцяжоў, на адшукваньне патрэбнага матар'ялу, з-за несваячасовай зваркі жалеза і рознай арганізацыйнай няўвязкі ў рабоце.

Какі крыху расшыфраваць гэтыя даныя, дык акажацца, што 16 рабочых непрадукцыйна затрачваюць у дзень 27¾ гадзін, або недагружаны на 22 проц. Іншымі словамі, гэта азначае, што калі поўнасьцю нагрузіць гэтых 16 рабочых, дык яны маглі-б без асаблівае нацяжкі выканаць дырэктыву ўраду аб павышэньні прадукцыйнасьці працы на 14 проц. і можна было-б выканаць гэту дырэктыву ў адносінах павышэньня іх заработку на 3 проц., пры данай, нават недапушчальнай колькасьці прагулаў.

Возьмем другі нагляд за гнуцьцём двума рабочымі арматурнага жалеза спэцыяльнай машынай. Тут вынікі яшчэ больш зьдзіўляючыя: за пяць дзён нагляду ўстаноўлена, што ў сярэднім па самае гнуцьцё жалеза затрачана ў дзень 1 г. 30 хвілін, на падрыхтоўку і зборку матар'ялаў—1 г. 31 хвіл., на падрыхтоўку машын да гнуцьця—25 хвілін, на арганізацыйныя прастоі—3 гадз. 14 хвіл. і прагулы 44 хвіліны.

Гэтыя даныя зьдзіўляюць папярэднімі і мы ня вусім яшчэ пераконаны, што тут улічаны ўсе фактары, якія ўплываюць на вытворчасьць, але і яны гавораць аб адсутнасьці пянаявасьці ў рабоце, непрадуманасьці і рацыяналізатарскай бязьдзейнасьці адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу. Можа было-б з гаспадарчага боку больш карысным, калі-б падрыхтоўка, падноска і адноска матар'ялаў выконвалася чорнарабочымі, а не самімі кваліфікаванымі арматурщыкамі?

Трэба адзначыць, што рабочыя ў большасьці сваёй зразумелі сэнс правядзімых хранамэтражных нагляданьняў і нават дапамагаюць ім, бо яны адчуваюць, што пры лепшай увязцы работы і зьнішчэньні ўсіх арганізацыйных недахопаў можна будзе ўзьняць прадукцыйнасьць працы, павялічыць заработную плату і патаніць будаўніцтва.

Сур'ёзнае хранамэтражаньне іншых будаўнічых працэсаў (кладку цэглы, бэтонныя работы, цясьлярскія работы, штукатурныя работы, сталярскія работы, мантаж асьпленьня і вэнтыляцыі) дасьць багаты бяспрэчны матар'ял для тэхнічнага нармаваньня будаўнічых работ і для рэгуляваньня расцэнак.

У сувязі з уступленьнем будаўнічых рабочых у сацыялістычнае спаборніцтва, калі кожны рабочы падцягваецца і ўшчыльняе свой рабочы дзень, вынікі далейшых хранамэтражных нагляданьняў абяцаюць быць досыць дакладнымі, каб яны маглі легчы ў аснову тарыфнай палітыкі пры наступнай калдагаворнай кампаніі.

Але і не чакаючы гэтага, неабходна цяпер-жа мабілізаваць рацыяналізатарскую думку адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу і саміх рабочых кожнай пабудовы і паставіць на адпаведную вышыню работу вытворчых нарад.

С—кі.

Рабселькоры--пішэце як ідзе праца па беларусізацыі

Нацработа па саюзе трансраб пастаўлена слаба

Антысэміты сярод грузчыкаў і аўтапрацаўнікоў

На ст. Менск працуюць у адным дзесятку два рабочыя грузчыкі: Насевіч і Круглік. Першы—беларус, другі—яўрэй. Насэвічу стары Круглік чамусьці неспадабаўся. То ён бярэ яго за бараду, то насыпае вапны за каўнер, а аднойчы дапусьціў такую агіднасьць, што пісаць пра яе проста брыдка. Цярпеў Круглік доўга.

Нарэшце, пытаньне аб выдасках Насевіча над старым рабочым было ўзьнята. Рабачком грузчыкаў доўга пасядаў, усіх апытаў і вынес саламонава рашэньне: факты зьдзекаў пацьвердзіліся, але носяць яны характар «жартаў», проста для таго, каб загрэцца на марозе. Ці-ж гэта жарты, таварышы з рабачкому? Чаму Насевіч аб'ектам сваіх жартаў абраў старога рабочага-яўрэя, а не каго-небудзь іншага?

Прэзыдыум ЦП у гэтым «жарце» прызнаў яўнае праяўленьне антысэмітызму...

«Жартуюць» і ў Магілеве. Грузчык Галадзёнак сыстэматычна зьдзекуецца над двума, што разам з ім працуюць, грузчыкамі-яўрэямі Шустэрам і Ласкіным. Іншага выразу на іх адрасе, апрача «жыдоўскае морды», Галадзёнак ня ведае. У апошні час гэта фраза пачала суправаджацца пляваньнем у твар і «матам». Мясцком грузчыкаў, члены якога працуюць тут-жа, пра гэта «ня ведаў». «Ня ведаў» да таго часу, пакуль цярпеўшыя не падалі ў мясцком заявы. Што-ж выраішуў мясцком? Ён абмежаваўся вымоваю. Пытаньне перайшло ў саюз. Там гаварылі шмат. Побач з рэакімі асуджэньнямі агідных фактаў знайшліся і абаронцы антысэмітаў, якія ўбачылі ў прасьледваньні рабочых-яўрэяў толькі асобны від «жартаў».

Ёсьць антысэміты ня толькі сярод грузчыкаў. Ёсьць яны і сярод кваліфікаванай і, здавалася-б, больш сьвядомай часткі членаў саюзу—аўтапрацаўнікоў. У Гомельскім гаражы майстры Цітовіч і Цішчанка называюць вучняў-яўрэяў «жыдоўскаю мордаю», «жыдоўская галава нічога не разумее», «тарты любяць хадзіць з кіямі, а нашы—працаваць».

У гаражы Менскага аўтакіраўніцтва рабочы Бязьмен называе вучняў-яўрэяў «жыдамі». Ён лічыць, што «яўрэй ня будзе шофэрам»...

Да гэтага трэба дадаць толькі наступнае: у пачатку мінулага году ЦП саюзу распрацавала плян нацыянальнай работы. Плян гэты абгаворваўся на пленуме ЦП. Чаго толькі ў пляне няма?

Але як гэты плян выконваецца? Пра гэта гавораць вынікі праверкі ступені выканаьня пляну. Гавораць-жа яны пра тое, што большасьць саюзных органаў да пытаньняў нацработы адносяцца з халадком.

Б. А.

Ад рэдакцыі: На жаль, т. Б. А. не паведамляе, як-жа рэагавала па ўсе гэтыя факты антысэмітызму само цэнтральнае праўленьне саюзу трансраб? Ці пакараны антысэміты?

Хваля растрат узрасла, а меры барацьбы паслаблі

Растраты сталі частым зьявішчам і супроць іх не мабілізуецца грамадзкая думка. — Замест таго, каб растратчыка выкінуць з грамады, яго падтрымліваюць, яму спачуваюць. — Недаацэньваюць усяго зла, якое прыносяць растраты. — Справы аб растратах гадамі затрымліваюцца ў канцылярыях судовых органаў.—Мяккасьць судовых прыгавораў у адносінах да растратчыкаў часамі мяжуецца з яўным патураньнем растратам

ПАГРАЖАЮЧЫЯ ЛІЧБЫ РАСТРАТ

Мы зараз у Беларусі зьяўляемся сьведкамі вельмі пагражаючага зьявішча—вялікага росту растрат у каапэрацыйных і гандлёвых арганізацыях, пераважна ў першых. Прычым гэта хваля растрат у каапэрацыі ідзе на павышэньне.

Для ілюстраваньня гэтага досыць падаць хоць-бы наступныя лічбы. У сучасны момант сума растрат (разам з усякай асабістай запазычанасьцю безнадзейнага характару) па аднэй толькі каапэрацыі БССР дасягае сумы ў 300 тысяч рублёў. Па 69 спажывецкіх таварыствах Менскай акругі ў мінулым годзе ня было зроблена растрат толькі ў 9 спажывецкіх таварыствах.

НАДЗВЫЧАЙНАЯ ШКОДНАСЬЦЬ РАСТРАТ

Аб надзвычайнай шкоднасьці растрат—і палітычнай і эканамічнай—ня прыходзіцца і гаварыць. Можна толькі паказаць на тое, што вакханалія растрат паслабляе і без таго напружанае фінансавае становішча каапэрацыі, што растраты кампрамэтуюць у вачох сялянства ідэю каапэрацыі, што часта можна чуць такія думкі сялян-пайшчыкаў: «навошта ўносіць паі, усё роўна растрацяць».

У нас грамадзкая думка не мабілізавана супроць растрат і растратчыкаў. Растратчык у нас ня носіць ганебных плям на ілбе, растратчыка—гэтага шкодніка дзяржаўнай справы—часта падтрымліваюць, яму спачуваюць («пабалаваўся хлопец»), лёгка прымайстроўваюць у іншай установе, калі ня ў тэй самай.

Тут у так званым бытавізьме растрат хаваецца асноўнае зло. А вакол гэтага асноўнага кораню кругамі разыходзіцца і яшчэ цэлы рад іншых прычын, якія садзейнічаюць росквіту і размнажэньню гэтай ганебнай шкоднай справы. Пастараемся разабрацца ў гэтых прычынах.

ШТО СПРЫЯЕ РАСТРАТАМ?

Тыя нядобрыя касныя кадры працаўнікоў каапэрацыйнага апарату, што ў нас ёсьць, за апошні час у зьвязку з разьвіцьцём каапэрацыі і значным павялічэньнем штатаў яшчэ больш пагоршыліся—туды яшчэ ў большай меры пралезьлі гандлёва-спэкуляцыйныя элемэнты.

Інструкцыйны апарат каапэрацыі вельмі слабы, там адсутнічаюць кваліфікаваныя працаўнікі. І вось прыедзе такі інструктар для праверкі каапэратыву і ня выявіць растраты, а апошняя ўжо выкрываецца потым, задоўга пасьля праверкі.

Даўно вядома, што пры ўсякіх балючых зьявішчах вельмі важны папярэджваючыя меры, якія ў даным выпадку ўскладаюцца на рэвізійныя камісіі. Але члены рэвізійных камісій перагружаны ўсякай іншай грамадзкай работай і ня могуць поўнасьцю аддацца рэвізійнай рабоце. Трэба членаў рэвізійных камісій вызваліць ад усякай іншай грамадзкай работы, прызнаючы іх рэвізійную работу асноўнай.

РАСТРАТЧЫКІ СКАРЫСТОЎВАЮЦЬ НЯДБАЙНАСЬЦЬ СУДОВЫХ ОРГАНАЎ

Скрозь і ўсюды наглядаюцца выпадкі, калі справы аб растратах затрымліваюцца ў канцылярскіх нэтрах судовых органаў па 2-3 гады, і, зразумела, усякая эфэктыўнасьць, усякі матыў запалохваньня вусім трацяцца. За гэты час растратчык пасьпее і хатку пабудаваць на растрачаныя грошы (перавёўшы яе на імя жонкі), або паедзе ў іншае месца, якое ім загадзя аблюбоўваецца,—шукай потым ветру ў полі і спаганяй з яго па выкананчым лісьце. Ненармальнае становішча павялічваецца яшчэ і таму, што судовыя органы разглядаюць справы аб растратах асобна ў крымінальным і грамадзянскім парадку.

А растратчыкі, карыстаючыся расхлябанасьцю судовых органаў, усякімі спосабамі стараюцца зацягнуць судовую цяганіну шляхам усякага роду абскарджаньняў, патрабаваньняў экспэртыз і г. д.

А тая мяккасьць карнай палітыкі ў адносінах растратчыкаў, якая ў нас часта заўважваецца, у сапраўднасьці ня ведае меры і межаў. Мы тут часамі падыходзім да мяжы простага патураньня растратчыкам. У нас зрабілася звычайным зьявішчам, што растратчык, нават асуджаны на 3-4 гады зьняволеньня, адседжавае якіх-небудзь паўгода і выходзіць на волю, працягваючы сваю шкодную работу. І недарма некаторыя растратчыкі, калі іх запалохвалі судом, адказвалі: «ёсьць суд, але ёсьць і амністыя».

А мяккасьць, асабліва далікатная мяккасьць многіх судовых прыгавораў у адносінах растратчыкаў? Тав. А. Вінаградаў гэтымі днямі нам расказаў аб абуравочым прыгаворы Гомельскага акруговага суду, які ў відзе памякчаючых акалічнасьцяй для растратчыка прызнаў яго невялікі заработак і тое, што ён растрату зрабіў не адразу, а на працягу некаторага пэрыяду часу.

У дадатак да гэтага мы яшчэ можам падаць наступны выключны выпадак, які меў месца ў Койданаўскім раёне. Там суд апраўдаў трох каапэрацыйных работнікаў, якія зрабілі значную растрату (старшыню Койданаўскага спажывецкага таварыства, члена праўленьня і загадчыка сталоўкі), хоць і прызнаў (і за тое дзякаваць), што яны нанеслі страты... Спажывецкае таварыства іску не прад'явіла, паколькі суд апраўдаў растратчыкаў. Вельмі характэрна тое, што адзін з растратчыкаў, карыстаючыся тым, што суд яго апраўдаў, прад'явіў спажывецкаму таварыству іск за прагул, а нарсуд Койданаўскага раёну прысудзіў у яго карысьць 570 руб. (гэта справа адбылася ў 1927 годзе).

Такія мяккія прыгаворы прывялі да таго, што сяляне сям-там сталі гаварыць—«мусіць савецкая дзяржава не шкадуе сялянскіх грошай, што не карае растратчыкаў».

Значна ўзросшая хваля растрат і паслабленьне барацьбы з імі зьвярнулі на сябе ўвагу ЦКК-РСІ, якая ў бліжэйшыя дні абмяркуе і ўжыве рад мэрапрыемстваў для барацьбы з гэтым злом.

Саюз саўгандальслужачых пошуках апраўданьня сваёй бязьдзейнасьці

Беларусізацыя ў савецкіх і гандлёвых установах праводзіцца фармальна, у штодзённым жыцьці белмова ня ўжываецца.

Саюз саўгандальслужачых затраціў імат сродкаў на правядзеньне беларусізацыі, але дадатных вынікаў амаль што няма. Курсы павышанага тыпу, якія працавалі пры клюбе саўгандальслужачых, зьелі шмат сродкаў, а вынікі дрэнныя, бо большая частка слухачоў пакінула іх.

Па матар'ялах саюзу выходзіць, што беларусізацыя сярод служачых пасоўваецца ўперад слаба таму, што маса служачых не зразумела сутнасьці правядзеньня нацпалітыкі (?). І гэтае тлумачэньне даецца ў той час, калі ў шматлікіх справаздачах адзначалася, што асноўная маса ўжо добра ўявіла сабе сутнасьць нацпалітыкі і неабходнасьць беларусізацыі. А калі так, дык гэткае тлумачэньне трэба лічыць агаворкамі, якія апраўдалі-б бязьдзейнасьць або слабую працу саюзу ў гэтай галіне.

Між іншым, самі супрацоўнікі саюзу ў сваёй штодзённай працы ўжываюць выключна расійскую мову, ня гледзячы на тое, што некаторыя з іх добра ведаюць белмову.

Клюбная праца ў большасьці праводзіцца на расійскай мове.

Бібліятэка клюбу саўгандальслужачых на 1 студзеня 1929 г. мела 9.700 экз. кніг, з гэтай колькасьці толькі 750 кніг на белмове.

Зусім дрэнна стаіць справа з беларусізацыяй у гандлёвым апараце. Супрацоўнікі крам ня хочуць вывучаць белмовы, як быццам гэта іх не датычыць.

Наша прапанова беларускім пісьменьніцкім арганізацыям

Арганізуйце паказ калектыўнай вёскі

Пісьменьнікі--у калгасы, камуны і саўгасы

Ставячы гэта пытаньне, мы не баімся таго, што знойдуцца такія людзі, якія сустрэнуць нашы прапановы гіранічнай усьмешкай. Магчыма, але тыя горш для гэтых «чыстых» парнасцаў. Асноўная-ж маса беларускіх савецкіх пісьменьнікаў, мы ўпэўнены, адносецца да гэтага пытаньня з уважлівасьцю, якое яно заслугоўвае.

А сутнасьць пытаньня ў наступным: у Беларусі ёсьць шмат саўгасаў, камун і калгасаў, якія растуць, пашыраюцца і мацнеюць. Яны зьяўляюцца ў самым шырокім сэнсе асноўнымі падважнікамі па перабудове распыленай і адсталай вёскі на новых калектыўных пачатках. Зразумела, што гэтымі агульнымі словамі далёка не перадаецца ўся вялізарная творчая работа, усе супярэчнасьці і барацьба перадавых пластоў вёскі за новае лепшае жыцьцё.

Кожны саўгас і асабліва калгас—гэта цэлая яскравая кніга з падзеямі і ахвярамі, гэроямі і дэзэртырамі, з перамогамі і паражэньнямі, словам—жывая кніга жывых і вялікіх на сваёй пэрспэктыве спраў.

Ці многа старонак гэтай кнігі (правільней, кніг) адкрыта нашаму савецкаму чытачу? Што яны ведаюць пра тых, хто ўжо сёньня атрымаў рад перамог над зямлёю, пры дапамозе машыны і калектыўнай працы? На жаль, прыходзіцца сказаць, што гэта вялікая кніга аб «рэфарматарах зямлі» ня толькі не напісана, але амаль зусім не пачата. За апошні год мы мелі рад раскіданых па газэтах карэспандэнцкіх нататак аб калгасах і саўгасах. Але трэба сказаць праўду, што ўсе гэтыя нататкі насілі выключна аматарскі характар, не закраналі самога «нутра» тэмы. Пішучым не хапае сутнасьць тэмы, якое адзіна можа захапляць і пераконваць.

Зразумела, што мы ня хочам вінаваціць у чым-небудзь гэ

Да перавыбараў у жылкаапэрацыі

Сёлетняя перавыбарчая кампанія жылкаапэрацыі адбываецца ва ўмовах грандыёзнага разгортвання індустрыялізацыі краіны і падняцця народнай гаспадаркі, ва ўмовах завяршэння клясавай барацьбы і наступлення на нэпмана і кулака. Жыльлёвае пытаньне, зьяўляючыся адным з пытаньняў, абумаўліваючых бытавы і матар'яльны дабрабыт рабочых, мае асабліва паважнае значэньне, а таму гэта кампанія ня можа абмежавацца толькі пераабраньнем органаў кіраўніцтва і кантролю ў ЖАКТ'ах і ЖБКТ, але яна павінна абярнуцца ў гэнэральны агляд усёй дзейнасьці, у праверку выкананьня дырэктыў і задач, якія перад ёй пастаўлены, падкрэсьліваючы пры гэтым дасягненьні і зьнішчаючы недахопы ў нашым каапэрацыйным будаўніцтве.

Перавыбарча-справаздачная кампанія гэтага году (з 25 мая па 1-е ліпеня) павінна прайсьці ва ўмовах шырока разгорнутай самакрытыкі, пад знакам вучоту дзейнасьці жыльлёвай каапэрацыі за справаздачны пэрыяд, пры тлумачэньні шырокім каапэраваным масам чарговых задач партыі і савецкай улады ў жыльлёвым пытаньні. Жыльлёвая каапэрацыя, гэта орган мабілізуючага і арганізуючага самадзейнасьць шырокіх мас для разьвязаньня пастаўленых задач і завяршэньня сваёй увагі на ўзмацненьні рабочага ўпływу ў ЖАКТ'ах і ЖБКТ і павялічэньні рабочых у складзе органаў кіраўніцтва і кантролю, а таксама ў складзе членаў ЖАКТ'у. Трэба таксама завярстрыць увагу на далейшым павялічэньні нормы жыллошчы рабочага насельніцтва; на высяленьні непрацоўнага элемэнту і прадстаўленьні аслабанёнай такім чынам плошчы для рабочых, трэба сконцэнтраваць увагу усіх членаў ЖАКТ'у і іх утрымацаў на пытаньні выхаваньня ў іх адказнасьці і сапраўдна-гаспадарчых адносін да жакташкай маемасьці; больш рашучае ўцягненьне жанчын—членаў сямей працоўных, у члены каапэрацыі і органы кіраўніцтва і кантролю; узмацненьне каапэраваньня ўсіх праваздольных членаў сям'і ў жыл. арэндныя каапэратывы; поўны ахоп муніцыпалізаванага жыльфонду.

Трэба растлумачыць і зьвярнуць увагу насельніцтва на тое, што ва ўмовах перажываемага намі пэрыяду рэканструкцыі народнае гаспадаркі на падставах індустрыялізацыі, жыльлёвае пытаньне мае асабліва важнае значэньне і зьяўляецца адным з важнейшых народна-гаспадарчых праблем, што павышэньне культурнага ўзроўню рабочых, уздым працоўнай дысцыпліны, уздым вытворчасьці працы і як вынік гэтага зьнішэньне сабекошту прамысловай прадукцыі і павышэньне яе якасьці ў значнай ступені залежыць ад паляпшэньня жыльлёвых умоў насельніцтва.

Пасьпяховае праведзеньне справаздачна-перавыбарчай кампаніі, пры актыўным удзеле каапэраванага насельніцтва, дасьць магчымасьць зьнішчыць хібы ў нашай—жакташкай працы і больш энэргічна праводзіць барацьбу на жыльлёвым фронце, узгодняючы гэта з задачамі, якія паставіла партыя перад усёй краінай.

А. Левін.

Пасылка на працу

Біржа працы выклікае 31 мая на 8 гадз. раніцы наступных таварышоў для пасылкі іх на работу. Тыя, што не зьявяцца ў паказаны тэрмін, будуць зьняты з вучоту біржы працы.

Дрэвапрацоўшчыкі: Асташэвіч М. Я., Асташэвіч М. Ю., Асташэвіч А. Ю.

Чыгуначнікі: Сіцікэвіч Я. У., Крук Б. А., Фейгельман У. С., Маршчонак А. Я., Гілебіцкі М. Х., Казлоў С. М., Корпенка Д. Д., Жукоўскі А. А., Былінскі П. Я., Кісялёў М. Ц., Доўнар Я. Я., Шудліно А. С., Лютарэвіч Я. Ф., Людчык С. К.

Р. З. Л.: Конан В. В., Кісель А. П., Звейно Я., Жывіцкі А. Ф., Емец Б. Б., Дыліковец Я. Я., Гарамыка П. Я., Гурскі У. Я., Баракса П. Ц., Беляновіч Г. Я., Амбражэй А. М., Рашкевіч А. І., Конанаў К. Я., Маскаленак А. А., Карновіч П. Я., Бураў А. М., Торон А. Н., Якіменка П. Б., Яваровіч М. Д., Чайкоўскі Я. М., Шылік А. Ф., Шабуневіч І. М., Ігнатовіч К. Б., Тамашэвіч Л. А., Тутомша Ул., Сапешка А. А., Сятун А. Г., Дрэй К. Я., Міранович Б. А., Паўловіч А. С., Пятрусевіч Я. В.

Саўгандальслужачыя: Сьвярдлоў М. Ш., Жэўжык І. П., Якубоўскі В. Т., Крук З. К., Левін Ц. Б., Крывіцкі А. К., Бенік А. Б., Рыжаўскі Я. П., Разумовіч М. Я., Вягонскі Я. С., Долмантаў І. З., Пліско М. Т., Антанюк Ф. Н., Сахоцкі К. Я., Русак А. Е., Ганесеў С. Т., Усатаў Я. Б., Сэрбялюк А. Я., Драгобіч А. Б., Рыжыкаў Ф. У., Драгун М. А., Гладкі А. М., Метліг Я. Е., Навіцкі М. С., Гамзовіч Б. Я., Кунтэвіч П. Т., Альшэўскі У. П.

Будаўнікі: Ярмалкевіч У. З., Юзэфовіч К. П., Шпыш І. А., Трушынскі М. А., Позьняк П. П., Позьняк У. А., Любно Л. Б., Тамейка К. Я., Гарміза У. В., Вольскі С. С., Конан Я. Я., Купэйка Я. Г., Карась М. С., Красьніцкі Т. Я., Кушынка А. С., Капылоў З. М.

Друкары: Зянкевіч Ю. Ф., Туніцкі С. К.

Р. К. Г.: Александровіч М. М., Зуеў М. М., Тораўко У. А., Курбатаў М. С.

Мэталісты: Ліходзіеўскі М. Я.

Чорнарабочыя: Абмэшко І. Я., Аляксеєў П. П.

Ня члены саюзу: Міклуш У. А., Пяжуна П. Ю., Мяшок Я. Я., Лібава С. І., Хэйфэц І. М., Кесель М. М., Добравольскі Я. З., Полтаржыцкі Я. А., Бегароў М. А., Фалей М. Я., Куніцкі Я. А., Доморощкі Я. Т., Язьвінскі В. Я., Контороваа Б. М., Бельцаў Д. Н., Заводнік А. М., Жыбурт А. У., Вараноўіч Б. Я., Послевай М. М., Вяржбіцкі М. П., Астапаў М. М., Бажэйка Я. К., Крумнач М. Г., Патапчык А. А., Пазьнякова Э. Ф., Філітоўскі М. Х., Турок Т. С., Андрыеўскі В. Ф., Альтман С. Л., Мікуліч А. Э., Ярота Б. Ц., Паўловіч У. С., Гелін А. Л., Рогіч А. Д., Крэмэнецкі М. Т., Тарноўскі С. К., Зохаш Б. Я., Валковіч П. М., Будай П. Ф., Якутовіч А. І., Шчалкун В. Ф., Чорный А. С., Тарасэвіч У. А., Сідарэнка В. С., Сьвяржынскі Я. Я., Сарокін П. Я., Суботка Я. Д., Русецкі Я. Я., Пікуля А. М., Луцкевіч П. І., Муравіцкі У. І., Мамышка І. М., Мыс Б. М., Маўчанскі М. Р., Лось Я. Т., Казлоўскі А. Г., Пліско П. Я., Швэйдэль Л. Ю., Красуцкі А. Я., Кірлік А. М., Кляноўскі А. З., Кісялёў Р. А., Калоша С. М., Капончык М. В., Іваноў Я. С., Хіжчаўскі Р. В., Войніцкі К. М., Вансовіч У. М., Багдановіч А. Ш., Акулаў Ц. Н., Антропаў М. П., Нядзьведзяў Р. М., Гурэвіч С. І., Лукашэвіч А. К., Мэзін Я. Ф., Лукота П. Г., Муха І. С., Мацюшэвіч У. А., Лясковскі В. К., Лапкоўскі К. В., Лобач М. В., Ляшой М. Я., Крук Я. С., Кучмель А. А., Кандратовіч В. П., Казаноўскі Д. А., Доўгі С. Д., Гаварскі А., Гарбуз А. А., Гарновіч К. П., Бруднэр Л. М., Бабровіч Ф. Я., Авэрын С. К., Адамовіч Р. С., Брэнгуш Б. А., Вранапецкі Л. С., Валновіч У. А., Банецкі Я. К., Рэгіма Я. С., Урунь К. Ф., Бяйнінсон А. Ш., Жораў Р. Р., Зароўскі Я. А.,Дунскі Г. Р., Бярэзаў М. Я., Арціж У. Я.,Бергер Г. Х., Жылка М. А., Жданоўіч А. А., Жыдовіч М. К., Жусоў М. А., Жданоўіч С. М., Жук М. М., Жутоўскі В. Я., Журоўскі П. К., Жук А. З., Жаровіч Э. Я., Жывшча Я. Н., Ждзяжуко Д. Я., Дурыноў Ц. П., Гаузьбіт М. Б., Глеб У. К., Гурскі А. П., Грынкэвіч Б. Я., Вярцінскі Я. А., Войніч У. Я., Вардомскі У. Я., Выш Я. Я., Гэлер Б. Л., Бепастацкі М. І., Буцавіцкі В. Я., Бразоўскі М. А., Быхаўскі Е. Р., Душынскі А. С., Шалыт К. Ю., Шалыт Я. У., Шыбалка М. Г., Чорнуха А. С., Чайко А. С., Цалковіч Б. К., Цэхановіч А. Б., Цынкевіч А. Б.. Хадаркевіч К. Б., Цэлухін Т. Я., Тумэль М. М., Раўтовіч А. Я., Трус Я. К., Сьцефановіч М. А., Станкевіч Р. С., Слежук Я. Ф., Рамашэўскі А. Я., Раўзюк В. С., Прылуцкі М. В., Акуліч П. А., Мархель К. Я., Мышолін Р. М., Мацкевіч С. К., Малішкевіч Д. С., Поклечы Я. Д., Матусэвіч С. М., Глеб Я. Д.

Работа інстытуту па ахове працы

Беларускі інстытут па ахове працы заняў заняты вывучэньнем скуранай прамысловасьці. Пад кіраўніцтвам інстытуту вывучаецца стамленьне рабочых на Дняпроўскай мануфактуры ў сувязі з пераходам фабрыкі на 7-гадзінны рабочы дзень. У Віцебскай акрузе вывучаюцца ўмовы працы плытагонаў, у Гомельскай—будаўнікоў і ў Бабруйскай акрузе—працаўнікоў па мэліярацыі.

У інстытуце праводзіцца псыха-фізіялёгічны адбор рабочых у ЦПІ і ФЗУ, пры якія прапускаецца да 200 чалавек у месяц. Інстытут атрымаў дадатковае замежнае абсталяваньне для фізіялёгічнай лябараторыі.

МЕНСК

Сацыялістычнае спаборніцтва паміж навучальнымі і навукова-дасьледчымі ўстановамі

ЦБ навуковых працаўнікоў абгаварыла пытаньне аб праведзеньні сацыялістычнага спаборніцтва паміж вышэйшымі навучальнымі ўстановамі і навукова-дасьледчымі ўстановамі БССР.

Па думцы ЦБ аб'ектамі спаборніцтва могуць быць: пасьпяховасьць студэнтаў, ідэалёгічна-вытрыманы зьмест навуковай працы, грамадзкая актыўнасьць студэнцтва і выкладчыкаў ВНУ, мэтадаелёгія і навуковыя дасягненьні, беларусізацыя, падрыхтоўка кадраў і інш.

Адначасова будзе праводзіцца конкурс на два найлепшыя навуковыя калектывы, што далі на працягу апошніх пяці год найбольшую навуковую прадукцыю,—адзін ва ў мовах добрага абсталяваньня і другі пры дрэнным абсталяваньні лябараторый.

Спаборніцтва пачнецца пасьля шырокага абгаварэньня прынцыпаў, зьместу і парадку яго на агульных сходах калектываў вышэйшых навучальных устаноў і навукова-дасьледчых інстытутаў БССР.

Курсы беларусазнаўства для настаўнікаў бел. школ у РСФСР

У бліжэйшы час у Менску адчыняюцца месячныя курсы беларусазнаўства для настаўнікаў беларускіх школ у РСФСР. На курсы прыдуць да 30 настаўнікаў з розных гарадоў РСФСР. Мэтадком зацьвердзіў навучальны план курсаў. Курсы адчыняюцца за кошт Наркамасьветы РСФСР.

Літаратура для малапісьменных

Цэнтральны савет таварыства «Прэч Няпісьменнасьць» здаў у друк 2 кніжкі для малапісьменных, якія скончылі ліквпункты. Пакуль выдаюцца кнігі «Сталін аб Леніне» і „Калгас Бальшавік". Рыхтуецца да друку яшчэ 5 папулярных брашур. Кнігі рассылаюцца дарэмна ва ўсе хаты-чытальні, клюбы і іншыя палітасьветныя ўстановы.

Менская школа сьляпых пераведзена ў Чырвоны Берег

Учора Менская школа сьляпых пераведзена ў Чырвоны Берег, Бабруйскай акругі. Туды-ж пераводзяцца 50 вучняў-сьляпых. Для школы адведены дом былога аграпэдтэхнікуму з інтэрнатам, 10 гэктараў пахаці, парк і сад. У Чырвоны Берег пераводзіцца таксама шчотачна-карзінаначная майстэрня. Мяркуецца значна пашырыць працоўнае выхаваньне сьляпых шляхам скарыстаньня іх на с.-г. работах.

У Беларускай Акадэміі Навук

Выбары новых акадэмікаў

У бліжэйшы час адбудуцца выбары двух новых акадэмікаў Беларускай Акадэміі Навук па катэдрах хэміі і батанікі. Паводле параграфу 20 статуту Акадэміі Навук, кандыдаты ў акадэмікі могуць выбірацца вышэйшымі навучальнымі ўстановамі, грамадзкімі арганізацыямі і групамі паасобных вучоных. Пры Беларускай Акадэміі Навук утворана спэцыяльная камісія для разгляду кандыдатур.

Акадэмічныя выданьні твораў беларускіх пісьменьнікаў

Вышаў з друку ў выданьні Акадэміі Навук другі том твораў выдомага беларускага пісьменьніка Багдановіча. У гэтым томе маюцца разьдзелы: артыкулы па гісторыі літаратуры і крытыцы, беларуская грамадзкасьць, славянства, нататкі і рэцэнзіі, пераклады, а таксама вялікі крытычна-бібліяграфічны нарыс аб Багдановічу праф. Замоціна.

Друкуецца ў акадэмічным выданьні зборнік твораў Алеся Гаруна. Падрыхтоўваецца да друку зборнік твораў Цёткі і Багушэвіча.

Вывучэньне глебы Беларусі

З 1-га чэрвеня пачнуцца экспэдыцыі пад кіраўніцтвам акадэміка Афанасьсева па дасьледваньні глеб. Экспэдыцыі маюць на ўвазе дасьледаваць глебы раёнаў Гомельскай, Полацкай, Віцебкай, Магілёўскай і часткова Бабруйскай акруг. На чале Віцебкай дасьледчай групы стаіць акадэмік Афанасьсеў, Гомельскай—вучоны глебавед Акадэміі—Рагавы, па іншых групах—дацэнт Медзьведзяў.

На чыгунках

Курортныя вагоны

З 31-га мая пачнецца курсаваньне вагонаў Менск-Севастопаль, Менск-Эўпаторыя. Адпраўленьне з Менску штодзённа а 8 гадз. раніцы, прыбыцьце ў Менск штодзённа а 11 гадз. увечары.

З 1-га чэрвеня пачнецца курсаваньне вагонаў: Менск-Мінэральныя Воды. Адпраўленьне з Менску па аўторках, чацьвяргох і суботах а 8 гадз. раніцы. Прыбыцьце ў Менск па панядзелках, сэрадах і суботах а 11 гадз. увечары.

Заосіны Менск-Ленінград

З 2 чэрвеня вагон Менск-Ленінград будзе курсаваць штодзённа. Адпраўленьне з Менску ў 10 гадз. 12 хв. уночы з кур'ерскім цягніком. Прыбыцьце назад штодзённа ў 7 гадз. 25 хв. раніцы.

За дзень

— 2.800 РУБ. ПРЫБЫТКУ АД КАНЦЭРТУ КАЧАЛАВА. Акругком МОПР'у атрымаў ад вечару Качалава чыстага прыбытку 2.800 руб. Валавы збор за гэты вечар складаў 5.175 руб.

— АДКРЫЦЬЦЁ ЎСЕБЕЛАРУСКІХ КУРСАЎ БЯЗБОЖНІКАЎ. 6-га чэрвеня ў Менску адкрываюцца ўсебеларускія курсы саюзу „Бязбожнік". Менская акруга атрымала на курсах 8 месц.

— НАРОДНАЯ КАРУСЕЛЬ У САДЗЕ «ПРАФІНТЭРН». З сёньняшняга дня ў садзе «Прафінтэрн» пачынае працаваць народная карусель. Пры каруселі грае аркестр музыкі. Плата за 10 хвілін язды—10 кап.

— ПЕРАДАЧА БУЙНЕЙШЫХ ШВЭЙНЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ БЕЛШВЭЙТРЭСТУ. Наркамправы разам з Белшвэйтрэстам распрацоўвае пытаньне аб перадачы найбольш буйных швэйных прадпрыемстваў і працакалектываў Белшвэйтрэсту. У першую чаргу пад загад Белшвэйтрэсту пярэйдуць працакалектывы швэйнікаў Магілёўскай і Бабруйскай акруг.

— НОВЫ ПРАЦКАЛ. У БАРЫСАВЕ. Наркамправы адкрывае ў Барысаве новы працакалектыў на вырабе начыньня з простай і ацынкаванай бляхі. Працакалектыў разьлічаны на 100 чал. і пачне працаваць у жніўні.

— ПЕРАХОД МАГІЛЁЎСКАЙ ФАБРЫКІ ЦУКЕРАК ПАД ЗАГАД БЕЛХАРЧТРЭСТУ. Магілёўская фабрыка цукерак перадана Наркамправы пад загад Белхарчтрэсту. Раней гэтая фабрыка знаходзілася пад загадам кіраўніцтва працакалектывамі.

Адкрываюцца дзіцячыя пляцоўкі. Пры станцыі Менск-таварная адкрываецца пляцоўка для дзяцей чыгуначнікаў. Тры пляцоўкі адкрывае саюз будаўнікоў, дзьве з іх будуць знаходзіцца пры цагельнях.

Выпуск прафтэхшколы будаўнікоў. 8-га чэрвеня адбудзецца выпуск прафтэхшколы будаўнікоў. Школу канчаюць 13 каменшчыкаў, 7 маляроў і 5 цесьляроў.

Экскурсіі рабочых. З Менску выехалі першыя групы рабочых экскурсантаў. Друкары накіравалі дзьве экскурсіі ў 24 чал. у Маскву і Ленінград. Выехала таксама група экскурсантаў швэйнікаў.

Рамонт першай савецкай гасьцініцы. Праз тыдзень пачнецца рамонт 1-й савецкай гасьцініцы. У вьязжу з рамонтам часова закрываецца каля 20 нумароў. Да восені рамонт будзе скончаны.

Канфэрэнцыя саўгандальслужачых. У Менску адкрылася акруговая канфэрэнцыя саўгандальслужачых. Канфэрэнцыя заслухала даклад аб рабоце ЦП саюзу. Асаблівая ўвага была ўдзелена пытаньню аб чыстцы савецкага апарату.

40 тысяч руб. на арганізацыю дзіцячых ясьляў

СНК БССР адпусьціў дадаткова 40 тысяч руб. на арганізацыю летніх дзіцячых ясьляў і пляцовак на вёсках Беларусі. Да арганізацыі ясьляў ужо прыступлена.

Тэатр і кіно

Новыя пастаноўкі Белдзяржтэатру

Як прайшоў асеньня-зімовы сэзон

Асеньня-зімовы сэзон БДТ-1 у Менску канчаецца. Як прайшоў гэты сэзон? На гэта пытаньне дырэктар Белдзяржтэатру тав. Селях у гутарцы з нашым супрацоўнікам паведаміў наступнае:

— Сэзон, бязумоўна, прашоў здавальняюча. Пры 6 спэктаклях ў тыдзень запоўненых амаль на усе 100 проц. арганізаваным глядачом, тэатр усё-ж вытрымаў 4 вялікіх грунтоўных пастаноўкі «Запяюць верацёны», «Мост», «Бронецягнік» і «Інга». На першым месцы па ліку спэктакляў стаіць «Мост»—34 разы, далей ідуць «Верацёны»—31 раз, «Бронецягнік»—19 раз і «Інга» мае быць пастаўлена 10 раз.

«Інга» чацьвертая і апошняя пастаноўка БДТ-1 у гэтым сэзоне. 10 спэктакляў «Інга» ужо праданы загадзя розным арганізацыям. Сэзон скончыцца 9 чэрвеня, пасьля чаго тэатр выедзе на гастролі ў Бабруйск, дзе прабудзе месяц.

Апрача непасрэднага абслугоўваньня глядача сваім мастацтвам, тэатр меў сувязь з радам клюбаў, у якіх артыстыя з лябаранцкай групы кіравалі драматычнымі гурткамі.

Сумесна з некаторымі прафсаюзамі тэатр наладзіў таксама накалькі дыспутаў на прадпрыемствах, як аб паасобных пастаноўках, «Верацёны», «Мост», так і на тэму аб шляхох тэатру. Праведзены два агульна-гарадзкіх дыспуты—адзін з клюбам імя КІМ'у аб «Верацёнах», а другі з рэдакцыяй «Чырвонай Зьмены» аб шляхох беларускага тэатру. На чарзе агульна-гарадзкая канфэрэнцыя глядачоў, якая наладжваецца культаддзелам ЦСПСБ.

Што дасьць тэатр у новым сэзоне? У Бабруйску акрамя старых пастановак ён дасьць і новыя пастаноўкі, як «Верацёны» і «Мост». Рухомая сцэна, патрэбная для гэтых пастановак, будзе скарыстана ў яўрэйскім тэатры, які будзе там гастраляваць да прыезду беларускага тэатру.

З 15-га верасьня тэатр пачне сваю працу ў Гомелі, дзе прабудзе ўвесь асеньня-зімовы сэзон. Тэатр інтэнсыўна рыхтуецца да новага сэзону. Частка дэкарацыі і маемасьці ўжо перавезена ў Гомель.

Тэатр працуе над п'есай Курдзіна «Паміж начальніцамі», якая малюе жыцьцё Чырвонай армії. Аўтар п'есы вайсковец аднаго з кавалерыйскіх палкоў. П'еса ўжо прынята мастацкай радай і Галоўрэпэрткомам. Яна таксама абгаворвалася на агульным сходзе палітпрацаўнікоў Чырвонай армії і была адобрана. П'есу будзе ставіць заслужаны артысты рэспублікі Міровіч.

Рыхтуецца новая п'еса «Шлак»—Дзяржавіна, якую ставяць маладыя артыстыя Крыловіч і Рамановіч.

Зараз дырэкцыя абгаварвае плян новай п'есы з жыцьця камуністычных партый Зах. Эўропы. Атрымана згода рэжысэра БДТ-2 Разанава паставіць у першым Белдзяржтэатры інсцэніроўку апавяданьня Вядулі «Салавей», якая распрацоўваецца артыстым Зоравым.

Балетмэйстар Сямёнаў вядзе падрыхтоўчую працу да пастаноўкі новага беларускага балету на сучасную рэвалюцыйную тэму «Сон камсамолкі». Музыку для балету піша кампазытар Маркевіч.

„Памылка „енэрала" Стрэхі"

(«Культура»)

Камэдыя вытворчасьці «Совкино» „Памылка «енэрала» Стрэхі" („Перапалох") апавядае аб тым, якога перапуду нарабілі ў вёсцы словы: „разьвёрстка на курорты". Разьвёрстка—яно зразумела,а курорт—гэта што, можа што горшае за Сібір?—так успрыняла адна глухая вёска. Бюкратычную канцылярыцую мову. А калі разьвёрстка—значыць на кулака, тольки кулак адкулёўся, едзе сухарыны бядняк Захар. Жыцьцё яго—лядашчае, за сена, цялятка, парочка ён згодзен „адпакутаваць" за аднасяльчам... І паехаў лячыцца на курорт у Ліваадыю, даўнейшы палац Мікалая II. Тут яго дагледаюць, лечаць, а там, у вёсцы, за яго „ўдавоюх заляцаюцца цасьляр ды панамар. Ужо служаць паніхіду па памёршым, каб хутка і шлюб узяць... Тольні ён вярнуўся.

У камэдыі шмат штучнага і нацягнутага, што да сялянскага быту. Вёска, тым больш наша, не паверыць у тое, што паказвае фільм, яні ўвесь збудаваны на анэкдоце. Але разам з гэтым фільм мае і нешта дадатняе, праўда расплыўлівае. Гэта—ідэя яго, што тольні пры савецкай уладзе селянін можа трапіць на курорт.

У цэлым фільм зроблен даволі добра. Рэжысэрская работа вызначаецца мастацкасьцю падачы матар'ялу. Аператар вдалеў даць выразныя і прыгожыя здымкі, а сабліва натуры. Добра грае ролю сухарукага Захара артысты Воўкаў.

В.

— НОВЫ КІНО-ТЭАТР БУДЗЕ АДКРЫТЫ ЎВОСЕНЬ. Калегія Наркамасьветы зацьвердзіла праект пабудовы ў Менску новага кіно-тэатру замест згарэўшай «Чырвонай Зоркі». Калегія абавязала Белдзяржкіно скончыць пабудову новага кіно-тэатру да восені бягучага году.

3-га чэрвеня, а 6-й гадзіне ўвечары ў памяшканьні клюбу гарсавету (Пляц Волі) адбудзецца шырокая нарада акты ву ЦКК-РСІ з наступнай абвесткай дню:

1. Даклад Аб'яднанага Бюро Скаргаў НК-РСІ (дакл. т. Лазоўскі).

2. Плян перавыбарчай кампаніі рабочых засядаецляў Аб'яднанага Бюро Скаргаў.

На нараду выклікаюцца: члены ЦКК і Мен. АКК, якія знаходзяцца ў Менску, рабочыя засядацелі Аб'ядн. Бюро Скаргаў дабраахвотнікі, кіраўнікі груп «лёгкай кавалерыі», дэлегаткі, вылучаныя для працы ў Бюро Скаргаў, члены сэкцыі РСІ Менгарсавету, прадстаўнікі ад ячэек КП(б)Б, КСМ і фабзаўмясцкомаў.

Просьба зьявіцца без спазьненьня.

Нам. Наркома РСІ БССР КОНАНАЎ

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

— Сёньня, роўна а 6 гадзіне ўвечары, у памяшканьні райкому адбудзецца пленум Кастрычніка-вага РК КП(б)Б.

Просьба да ўсіх членаў і кандыдатаў РК, членаў і канд. рэвізійнай камісіі, зьявіцца без спазьненьня.

— 30 мая, а 6 гадзіне ўвечары ў памяшканьні залі пасяджэньняў АК КП(б)Б (пакой № 17) адбудзецца пленум Фрунзаўскага райкому КП(б)Б.

У парадку дня: заслухваньне тэзісаў справаздачы райкому на канфэрэнцыі.

2. Прыём у кандыдаты і перавод у члены партыі.

Прысутнасьць усіх членаў і кандыдатаў РК і членаў і канд. рэв. камісіі абавязкова.

— Назначаны на 30 мая, пленум цэнтральнага савету саюзаў бязбожнікаў у клюбе імя Р. Люксэмбург перанесіцца на 4 чэрвеня на 5 гадз. увечары.

Папраўка

У артыкуле „Ячэйка, якую трэба праверыць у першую чаргу", памылкова надрукавана «Парттройка пры Барысаўскім РК КП(б)Б прыступае да па-за чарговай чыстки ячэйкі», а трэба чытаць: «Парттройка пры Барысаўскім РК КП(б)Б вамеціла рад мерапрыемстваў па аздараўленьні ячэйкі. У прыватнасьці намечана правесьці па-зачарговую чыстку гэтай ячэйкі».

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ

БІБЛІЯГРАФІЯ

МАРКСЫЦКІ ЗБОРНІК, № 1, выданьне навуковага таварыства марксыстых Беларусі, Менск, 1929, стар. 227, цана 1 руб. 50 нап.

Першы зборнік вызьляецца адзіным адчувальным вынікам гадавое працы Беларускага навуковага таварыства марксыстых, «Першая ластаўка ня робіць вясны» і зьяўленьне гэтага зборніка атрымае ўвесь свой вялікі сэнс толькі тады, калі за ім пойдуць другія зборнікі, калі справа іх выданьня не застановіцца толькі на гэтым, першым.

Галоўнае, што кідаецца ў вочы пры чытаньні зборніка, гэта—адсутнасьць якоенебудзь сыстэмы пры зьбіраньні матар'ялу; матар'ял падбіраўся хаця і цікавы, але выпадковы. Здавалася-б, што за цэлы год працы навуковае таварыства павінна было-б накапіць досыць матар'ялу, каб выдаваць тэматычныя зборнікі. Другі недахоп зборніку—тое, што пераважная большасьць надрукаваных матар'ялаў, за выключэньнем артыкулу С. Я. Вальфсона „Марксыцкая навуковая работа ў БССР за 10 гадоў (1918—1928)" гаворыць аб досыць далёкіх ад сучаснасьці матэрыях. Пытаньні сучаснага сацыялістычнага будаўніцтва, нават і ў Беларусі, зусім не знайшлі адбітку ў зборніку? Няўжо-ж беларускае таварыства марксыстых не займаецца гэтым?

Аднак, ня гледзячы на гэта, у зборніку знайшлі сабе месца досыць цікавыя артыкулы. Акрамя памянёнага артыкулу С. Я. Вальфсона можна адзначыць яго-ж „Г. В. Плеханов і неўча", Б. Быхаўскі—«О методологии Дидро», П. Панкевіч—„Философское мировоззрение Н. А. Добролюбова", Р. Выдра—„Эмпирическая социология Визе и здравый смысл", Н. Шапавалаў—„К вопросу о понятии науки", Е. Рыўлін—«Аграрная дискуссия в германской с.-д.», І. В. Герчыкаў—«Конструктивный социализм». Акрамя таго ў кнізе зьмешчана стэнаграма дыскусіі, якая вялася на пасяджэньнях гістарычнай сэкцыі навуковага таварыства марксыстых аб творы тав. Агурскага «Гісторыя рэвалюцыйнага руху на Беларусі». Гэтай дыскусіі прысьвечана 35 старонак дробнага шрыфту.

Большасьць артыкулаў, як можна больш з іх пералічэньня, напісана на расійскай мове. Будзем спадзявацца, што абяцаньне рэдакцыі зборніку, зазначанае ў прадмове, аб тым, што яна «будзе наўхільна імкнуцца да поўнага пераходу ў бліжэйшых-жа выпусках на беларускую мову»—будзе выканана.

У зборніку таксама няма бібліяграфіі навуковай літаратуры, ні хронікі дзейнасьці беларускіх навуковых арганізацый, нават і самога марксыцкага навуковага таварыства.

«Марксыцкі зборнік» мусіць зрабіцца органам вазьлічага матэрыялізму ў межах БССР. «Наша таварыства, як толькі хопіць умеласьці і сіл будзе няўхільна змагацца в усімі яўнымі і таемнымі ворагамі марксызму, хто-б яны ні былі, як-бы яны ні маскаваліся; супроць рэакцыйных антыматэрыялістычных вучэньня буржуазнага Захаду, супроць іх трусьлівых эклектычных падгалоскаў у нашай краіне, супроць рафармісцкага скажэньня ды перакручваньня марксызму, супроць яго вульгарызацыі і неразуменьня матэрыялістычнай дыялектыкі». Такія мэты ставіць сабе навуковае таварыства і першы зборнік на мэты сіл адказвае гэтым мэтам.

Кніга выдана добра і цана нявысокая.

Першы нумар «Марксыцкага зборніку» павінен зваісьці сабе шырокае распаўсюджаньне ня толькі ў межах БССР, але і па-за імі.

П. К—ын.

ТЭАТР і КІНО

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР
Адкрыты спэктакль. Чацьвер, 30 мая. Прэм'ера.
ІНГА
Сучасная п'еса ў 4 дзеях, 12 абразох.
Білеты ў касе тэатру. Пачатак а 8 гадз. увечары.

Летні тэатр «ПРАФІНТЭРН»
Гастролі МАСКОЎСКАГА ЭКСПЭРЫМЭНТАЛЬНАГА БАЛЕТУ
Чацьвер, 30 мая Апошні адкрыты спэктакль
„Лебединое озеро"
Пачатак а 9 гадзіне ўвечары.

КІНО-ТЭАТР „Культура" — Ад аўторка 28 мая — мастацкі фільм ПАМЫЛКА „ЕНЭРАЛА" СТРЭХІ — Весёлая камэдыя ў 6 частках. Зьвыш праграмы—Кіно-хроніка „Совкино" № 15.
Кіно-сад ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА Савецкая, 71. — 2-гі тыдзень! Ад аўторка 28 мая з прычыны вялізнага посьпеху ЧАНГ (Жахі джунгляй) Пачатак сэансаў—а 9 г і 10 г. 30 м.
КІНО Інтэрнацыянал — Ад аўторка, 28 мая — мастацкі фільм СЭРЦА і ДАЛЯРЫ Пачатак 1-га сэансу а 7 з пал. гадз. увеч. Каса адчынена ад 5 з пал. гадз.
КІНО Пралетарый — Ад аўторка, 28 мая КАХАНЬНЕ Ў ПРЫРОДЗЕ Пачатак—а 7 з пал. г. Каса—ад 6 г.
КІНО Спартак — Баяніі! Баяніі! ЛЯСНЫ ЗЬВЕР кіно-раман у 9 част. У гал. ролях: А. І. Салтыкоў, Панаў і А. Е. Юранеў. Каса—ад 6 г. Пачатак 1 с. а 7 г. 30 м.

ПАШЫРАНАЯ НАРАДА адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу менскіх трэстаў і прадпрыемстваў і майстроў апошніх
АДБУДЗЕЦЦА сёньня, 30 мая, а 7 гадз. у памяшканьні ДОМУ СЕЛЯНІНА
(а не у залі клюбу К. Маркса, як гэта надрукавана ў абвестцы ў № 119 «Зьвязды»)
ПАРАДАК ДНЯ:
1) Сацыялістычнае спаборніцтва ў прамысловасьці (дакл. т. КАРП).
2) Прынцыпы сацыялістычнай рацыяналізацыі (дакл. т. ФРЫД)

Скора! Вялікі мастацкі фільм (вытворч. БЕЛДЗЯРЖКІНО) Скора!
400.000.000
На экране кіно-саду «Чырвоная Зорка».

Толькі 2 дні засталося да 1 чэрвеня
Пасьпяшэйцеся СЕНЬНЯ-Ж падпісацца НА ГАЗЭТУ
ЗЬВЯЗДА
УМОВЫ ПАДПІСКІ: на 1 м.—90к., на 3м.—2 р. 60 к., на 6 м.—5 р., на 1 г.—9 р. 75 к.
«Зьвязда» дае сваім падпісчыкам дадаткамі на льготных умовах часопісы

БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ	Рабоче-Крестьянский КОРРЕСПОНДЕНТ	ОГОНЕК
1 м.—20 к. (замест 35 к.)	1 м.—25 к. (замест 30 к.)	1 м.—25 к. (замест 40 к.)

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА:
У Менску — У галоўнай канторы газэты «Зьвязда»—Савецкая, 63, 3-ці паверх, штодзенна ад 9—5 г., упоўнаважанымі галоўнай канторы.
У правінцыі: — Аддзяленьнямі БДВ, аддзяленьнямі выдавецтва „Известия" і „Правда", кіёскамі кантраг. друку і ўсімі пашт.-тэл. кан-мі.

Не спажывайце алькагольных напіткаў, шкодных для здароўя.
ПЕЦЕ толькі КАУКАСКІЯ НАРЗАН Натуральныя Мінэральныя Воды
ЭСЕНТУКІ № 20
Адзіныя сталовыя воды з натуральнай вуглякіслатой.
ЭСЕНТУКІ № 4, № 17, № 18 | БАТАЛІНСКАЯ СЬМІРНОУСКАЯ СЛАВЯНАУСКАЯ | БАРЖОМ
Са складу 25% адпускаюцца па гуртавых цэнах
з дарамовай дастаўай на дом.
Заказы вагонамі прымаюцца па зьніжаных цэнах і асобна льготных умовах.
КАРЫСТАЙЦЕ КАЎКАЗ на ДАМУ!
Замяняйце ўсе напіткі толькі адзіна-карысьнымі каўкаскімі водамі!
Рабочы склад Белмэдгандлю: Менск, рог Савецкай і Энгельса 26-92, тэл. 374.
АСЬЦЕРАГАЙЦЕСЯ ПІЦЬ ШТУЧНЫХ